16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 33 (5190) 19 жніўня 2022 г. ISSN 0024-4686

Колас, Маршак, Бёрнс стар. 4

Кніжная фея ляціць на падмогу стар. 11

Пачуць сімфонію жаху стар. 13

Мастак, які любіў Мінск...

Леанід Шчамялёў «Свіслач. Ратонда», 1987 г.

Выстаўка «Леанід Шчамялёў. Мой Мінск», прысвечаная 955-годдзю нашай сталіцы, адкрылася 17 жніўня ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Л. Д. Шчамялёва. У экспазіцыі прадстаўлены жывапіс і графіка з калекцыі галерэі «Прадмесце». Схаваная ў глыбіні Рэвалюцыйнай вуліцы выставачная пляцоўка прадставіла гасцям свае скарбы. Але атмасферу на адкрыцці экспазіцыі таксама стваралі дробязі: водар эфірнага масла і спевы «Песняроў», што напаўнялі залу. Усё гэта ўздзейнічала на гасцей і ператварала агляд выстаўкі ў сапраўднае падарожжа, дзе ад карціны да карціны — шлях, а кожнае палатно — адкрыццё.

Пад голас Мулявіна наведвальнікаў зацягваў шчамялёўскі Мінск: гарадское жыццё ў спакойных фарбах. На палотнах — знаёмыя кожнаму мінчаніну месцы, толькі асэнсаваныя майстрам. Аскетычнасць прасторы і насычанасць святла ў зале нібыта падкрэслівалі адлюстраванае на карцінах мастака. Як адзначыў падчас адкрыцця выстаўкі заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Васіль Касцючэнка, перад Леанідам Дзмітрыевічам ніколі не паўставала пытанне колеру. Маляваў так, як адчуваў, каб перадаць сваё бачанне іншым.

«ЛіМ»-акцэнты

Афіцыйна. На рэстаўрацыю і аднаўленне аб'ектаў са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці выдзелена 3 млн рублёў з фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Гэта прадугледжана распараджэннем, якое падпісаў Аляксандр Лукашэнка. За кошт выдзеленых сродкаў будзе рэалізаваны праект па рамонце даху і фасадаў царквы Раства Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна, што дасць магчымасць захаваць унікальны помнік архітэктуры сусветнага значэння і падрыхтаваць яго да святкавання 500-гадовага юбілею. Таксама будуць завершаны рэстаўрацыйныя работы ў сядзібна-паркавым ансамблі ў аграгарадку Залессе Смаргонскага раёна і на паўночна-ўсходняй аркадзе палацавага комплексу ў гарадскім пасёлку Ружаны Пружанскага раёна, праведзены кансервацыя з элементамі рэстаўрацыі ў сядзібна-паркавым ансамблі ў вёсцы Закозель Драгічынскага раёна і супрацьаварыйныя работы ў паўночна-ўсходнім корпусе замка Сапегі ў аграгарадку Гальшаны Ашмянскага раёна.

Конкурсы. Творчае спаборніцтва сінопсісаў (сцэнарных заявак) фільма па тэме «Легенды беларускага спорту» праводзіць да 31 кастрычніка Міністэрства культуры, паведамляецца на сайце ведамства. Пераможца конкурсу атрымае грашовую прэмію ў памеры 100 базавых велічынь і права на заключэнне дагавора з кінастудыяй на стварэнне літаратурнага сцэнарыя па сінопсісе і перадачу маёмасных правоў на яго выкарыстанне.

• З 8 жніўня 2022 года да 23 лістапада 2023 года Міністэрства культуры праводзіць конкурс рэжысёрскіх эксплікацый кароткаметражных студэнцкіх фільмаў. Да ўдзелу дапускаюцца студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі, магістранты, якія з'яўляюцца грамадзянамі Беларусі, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі краіны. Конкурс праводзіцца ў тры этапы па наступных намінацыях: «Кароткаметражны фільм у неігравой форме па тэме "Мой родны кут" (гісторыя малых гарадоў, вёсак, раённых цэнтраў Беларусі)»; «Кароткаметражны фільм у іграваой форме па тэме "Першае каханне"»; «Кароткаметражны фільм у іграваой форме па тэме "Гарадскія легенды"» (камедыя, містыка, фальклор)».

Актуальна. Журналістаў запрашаюць асвятляць урачыстасці ў гонар 1030-годдзя праваслаўя на беларускіх землях. 26 жніўня, у дзень здабыцця Мінскай іконы Божай Маці, у Мінску пройдуць урачыстасці, прымеркаваныя да святкавання 1030-годдзя праваслаўя на беларускіх землях. Цэнтральнай падзеяй стане саборная боская літургія, якую здзейсніць Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін у саслужэнні духавенства Беларускай праваслаўнай царквы перад Свята-Духавым кафедральным саборам. Перад богаслужэннем — сустрэча Усебеларускага хрэснага ходу да Мінскай іконы Божай Маці, які пачнецца 19 жніўня, у свята Праабражэння Гасподняга, ад Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра. Паломнікі пройдуць 250 кіламетраў праз чатыры епархіі і паклоняцца святыням 18 храмаў.

Праекты. Юбілейны альбом «Архівы: людзі і дакументы» да 100-годдзя дзяржаўнай архіўнай службы Беларусі будзе выдадзены ў верасні, інфармуе БелТА. Кніга расказвае пра асноўныя вехі станаўлення і развіцця архіўнай службы. Па задумцы аўтараў, яна будзе цікавая не толькі спецыялістам, але і простым людзям. «Мы хочам, каб у простага чалавека, які яе прачытае, склалася разуменне аб важнасці службы, яе развіцці і задачах, што стаяць перад ёй», — адзначыў дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Віктар Кураш. Асобны раздзел кнігі прысвечаны структуры, функцыям, асноўным напрамкам дзейнасці архіўнай службы Беларусі на сучасным этапе. Выданне кнігі плануецца ў верасні, а 6 кастрычніка, калі ў Беларусі будуць адзначаць Дзень архівіста, — яе прэзентацыя.

Навінка. Прэзентацыя новага паэтычнага зборніка акцёра тэатра і кіно, заслужанага артыста Беларусі Андрэя Душачкіна «Кола на абочыне» прайшла ў Мінску каля гарадской ратушы, гаворыцца на сайце «СБ. Беларусь сегодня». Кніга выйшла ў серыі «Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі». Артыст Нацыянальнага драматычнага акадэмічнага тэатра імя Максіма Горкага шмат гадоў сур'ёзна захапляецца паэзіяй, з'яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы. У творчай скарбонцы Андрэя Душачкіна — паэтычныя зборнікі «Адлюстраванні», «Па той бок люстэрка», «Лісты месяца». «За апошнія два гады гэта ўжо другі зборнік, — расказвае творца. — Разам з папярэднім "Аскепкі пачуццяў" цяперашні складае своеасаблівы двухтомнік, афармлены амаль у адзіным чорна-белым стылі. Тут сабраны мае разважанні, думкі і перажыванні пра дзень сённяшні. Апошнім часам пішу няспынна. Тэатр, вядома, заўсёды застаецца са мной, але і літаратурны шлях для мяне вельмі важны».

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Гід па творчых набытках

Адбылася рабочая сустрэча старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алеся Карлюкевіча з намеснікам міністра адукацыі Аляксандрам Кадлубаем. Размова ішла пра арганізацыю пісьменніцкіх сустрэч ва ўстановах адукацыі, найперш — у агульнаадукацыйных школах. Аляксандр Уладзіміравіч папрасіў Саюз пісьменнікаў Беларусі болей шырока інфармаваць школы краіны пра сучасную літаратуру і творчыя здабыткі пісьменнікаў.

Ёсць дамоўленасць, што з гэтай мэтай будзе падрыхтавана спецыяльнае інфармацыйнае выданне, у якім змесцяць звесткі пра навінкі кнігавыдання, падрабязныя анатацыі на творы сучасных беларускіх літаратараў.

На сустрэчы адзначалася, што пашырэння патрабуюць і пытанні развіцця літаратурна-мастацкай крытыкі, звароту да разгляду твораў сучаснай літаратуры дасведчанымі літаратуразнаўцамі, акадэмічнымі і ўніверсітэцкімі вучонымі.

Сяргей ШЫЧКО

супрацоўніцтва

На старонках узбекскай газеты

12 жніўня ташкенцкая пісьменніцкая газета «Узбекістон адабіят ва саньят» («Узбекская літаратура і мастацтва») вялікім артыкулам Рысалат Хайдаравай адзначыла 105-гадовы юбілей народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі.

Для сённяшняга часу, калі і многія літаратурныя сувязі разарваныя, калі і ўвага да мастацкага слова сыходзіць на нішто, — гэта добры знак, добрая падзея ў развіцці беларуска-ўзбекскіх літаратурных стасункаў на сучасным этапе. У тэксце — і цытаты з вершаў П. Панчанкі, падрабязны разгляд яго твора «Родная мова». І — згадка пра аднаго з узбекскіх перакладчыкаў беларускага мастака слова Азіза Саіда.

У звязку з узбекскай публікацыяй прыгадалася, што ў П. Панчанкі ёсць добры верш, адрасаваны ўзбекскаму паэту Турабу Тула (1918—1990). «Вось яшчэ малое намаганне, // І дакладна ўсё ўспомню я… // Недзе ў Бухары ці Намангане // Ты ішла, харошая мая. // У такой вясёлкавай спаднічцы, // А на кофце трыццаць тры касы. // Пэўна, я на сто гадоў спазніўся, // Не сустрэў раней такой красы…» І далей: «Як фазан, прашастала імкліва, // Пазаві — я следам паспяшу… // А мой друг Тураб глядзеў раўніва // На маю славянскую душу». Твор гэты ўвайшоў некалі ў сімпатычны зборнік Пімена Панчанкі «Крык сойкі». Перадрукаваны верш і ў трэцім томе Збору твораў П. Панчанкі ў чатырох тамах.

Нагадаем, што вершы Пімена Панчанкі раней паўзбекску друкаваліся ў Ташкенце ў калектыўных зборніках у перакладах Х. Гуляма і Ю. Шамансурава — у 1951 і 1962 гадах.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

вернісаж

Па той бок люстра

Адкрыццё часовай экспазіцыі «Залюстроўе» днямі адбылося ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа: аснову яе склалі ілюстрацыі Мікалая Селешчука да твораў беларускага класіка. Выстаўка прымеркавана да 75-годдзя з дня нараджэння мастака.

Да літаратурнай спадчыны народнага паэта Беларусі, акрамя Мікалая Селешчука, звярталіся многія айчынныя мастакі. Сярод іх — Валянцін Волкаў, Васіль Шаранговіч, Эдуард Агуновіч, Арлен Кашкурэвіч, Георгій Паплаўскі.

Папулярнасць Мікалаю Селешчуку прынеслі яго жывапісныя работы. Але папярэднічала ім творчасць, звязаная з кніжнай графікай. Пачалося ўсё з работы над ілюстрацыямі да зборніка дзіцячых апавяданняў Якуба Коласа «Страшнае спатканне». А вось адной з апошніх кніг, якую афармляў Мікалай Селяшчук, была паэма «Сымон-музыка».

У фондах Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа захоўваюцца арыгіналы ілюстрацый да зборніка апавяданняў «Страшнае спатканне». Усе яны і прадстаўлены ў межах выставачнага праекта разам з копіямі ілюстрацый да паэмы «Сымон-музыка».

Ілюстрацыя да паэмы «Сымон-музыка».

На вечары ўспамінаў, якім пачалося адкрыццё часовай экспазіцыі, выступілі вядомыя беларускія пісьменнікі, чые кнігі ілюстраваў Мікалай Селяшчук, а таксама яго сябры.

Аліса БРАТКА

анонс

«Звязда» выдасць анталогію сучаснага апавядання

Уранейшыя дзесяцігоддзі добрай традыцыяй было выданне калектыўных зборнікаў найлепшых твораў сучасных пісьменнікаў. Гэтым займаліся і рэспубліканскія, і ўсесаюзныя кніжныя выдавецтвы. У Саюзе пісьменнікаў Беларусі прынята рашэнне ўзнавіць гэтую традыцыю.

І першы сярод такога кшталту творчых праектаў — зборнік «Сучаснае беларускае апавяданне». Як укладальнік будучай кнігай апякуецца старшыня секцыі прозы СП Беларусі вядомы і аўтарытэтны ў краіне літаратар Алесь Бадак. Зборнік пабачыць свет у Выдавецкім доме «Звязда».

— Спадзяюся, што ў спаборніцтве прадстаўляць беларускае апавяданне апошніх гадоў перамогуць найлепшыя, найболей таленавітыя аўтары, — дзеліцца сваімі развагамі Алесь Мікалаевіч Бадак. — Хацелася б, каб у сабраных разам творах была адлюстравана палітра сённяшняга жыцця. Спадзяюся, што побач будуць змешчаны апавяданні і сталых аўтараў, і маладых літаратараў, якія яшчэ толькі пачынаюць свой шлях, знаходзяцца каля вытокаў будучых здзяйсненняў.

Мікола БЕРЛЕЖ

з нагоды

Пісьменніцкае спаборніцтва

Вынікі Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Іван Шамякін. "Сэрца на далоні"», прысвечанага Дню беларускага пісьменства, падвялі ў Гомелі. Як адзначыў старшыня аргкамітэта творчага спаборніцтва старшыня Гомельскага абласнога аддзялення СПБ Уладзімір Гаўрыловіч, у намінацыі «Кароткае апавяданне» на конкурс даслана 55 апавяданняў, а ў намінацыях «Проза» і «Паэзія» арганізатары атрымалі 25 мастацкіх кніг, выдадзеных на працягу 2021—2022 гадоў.

Сумесным рашэннем экспертнай камісіі і Савета Гомельскага абласнога аддзялення ў намінацыі «Паэзія» пераможцамі прызнаны: Наталля Міхальчук (Гран-пры за зборнік вершаў «Светлы дзень»), Уладзімір Несцяровіч (1-е месца за літаратурна-мастацкі зборнік «Не гром нябесны»), Тамара Кавальчук (зборнік паэзіі «Любовью рождённые строки»), Таццяна Шульга (паэтычны зборнік «Попутного ветра!») — абедзве занялі 2-е месца. 3-е месца вырашана не прысуджаць. Пераможцы ў намінацыі «Проза» наступныя: Гран-пры — Зінаіда Дудзюк («Паляванне зграяй»), 1-е месца — Таццяна Кудраўцава («Маша і яе чароўны лес»), 2-е месца — Вольга Раўчанка («Счастье. Антипритча»), таксама 2-е — у Раісы Дзейкун («Сплотка»). Трэцяе месца не прысуджалі. У намінацыі «Кароткае апавяданне» найлепшымі сталі Ніна Рыбік (1-е месца за твор «Макотра кашы») і Валянціна Кадзетава-Арэстава (1-е месца за твор «Гараджанка і лясун»). 2-е месца падзялілі Тамара Кручэнка («На родных прасторах»), Ганна Атрошчанка («Юныя абаронцы»), Веніямін Бычкоўскі («Дзяўчынка-восень»), Іван Цітарэнка («Нявеста з парасятамі»). 3-е месца занялі Таццяна Цвірка («Пачатак»), Наталля Царанкова («Сонечныя зайчыкі»), Вольга Таляронак («Лецішча»), Віктар Арцем'еў («Тры сустрэчы з Іванам Шамякіным»).

Узнагароджанне пераможцаў Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Іван Шамякін. "Сэрца на далоні"» адбудзецца 4 верасня ў Добрушы каля помніка народнаму пісьменніку.

Улад ПРЫАЗЁРНЫ

да ведама

Не існуе абмежаванняў

Філіял Музея гісторыі горада Мінска арт-гасціная «Высокае мѣста» 25 жніўня запрашае ўсіх на майстар-клас па калажыраванні. Мерапрыемства адбудзецца ў рамках персанальнай выстаўкі фатаграфіі і аўтарскай інсталяцыі Кацярыны Кенігсберг «Крок за крокам». Майстар-клас правядзе сама Кацярына Якаўлеўна, кандыдат мастацтвазнаўства, куратар міжнародных выставачных праектаў у Беларусі і за яе межамі, начальнік аддзела міжнародных сувязей Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, член грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз мастакоў».

Пад словам «калаж» трэба разумець прыём альбо творчы метад у выяўленчым мастацтве, калі аўтар дзеля дасягнення асаблівага эфекту наклейвае розныя прадметы і матэрыялы на паверхню, адрозную па колеры і фактуры, размяшчаючы іх у адмысловым парадку. У якасці выяўленчай адзінкі могуць выкарыстоўвацца выразкі з газет, часопісаў, кавалкі тканіны, скуры, прыродныя матэрыялы, фатаграфіі, нават прадметы побыту... Па вялікім рахунку, абмежаванняў у выбары прадметаў для наклейвання (акрамя хіба што тэхнічных) не існуе. Уласна, калаж вядзе сваю гісторыю ад пачатку XX стагоддзя.

За час існавання калаж са звычайнага выяўленчага прыёму ператварыўся ва ўніверсальны мастакоўскі інструмент. Ён здолеў перасягнуць межы прасторавага мастацтва, і сёння прынцыпы калажу актыўна выкарыстоўваюцца ў фатаграфіі, кінематографе, музыцы, літаратуры ды іншых кірунках творчай дзейнасці. Удзельнікі майстар-класа ў арт-гасцінай «Высокае мѣста» змогуць стварыць уласныя работы з прымяненнем тэхнікі калажыравання, а таксама ўбачыць экспазіцыю фатаграфіі і аўтарскай інсталяцыі Кацярыны Кенігсберг «Крок за крокам», якая гэтымі днямі дэманструецца ў выставачнай прасторы.

«Калаж у сучасным мастацтве грунтуецца на ідэі. На першы погляд, гэта няцяжка: белая і каляровая папера, клей, любыя ілюстрацыі (самаробныя ці са старых часопісаў і газет), каляровыя алоўкі ці фламастары. Раскладзіце ўсё гэта перад сабой і задайце пытанне: "Што з гэтым рабіць?". І вось тут пачынаецца самае цікавае, таму што зрабіць можна ўсё што заўгодна, але… спачатку трэба знайсці ідэю і толькі потым брацца за яе рэалізацыю. Менавіта гэтым мы будзем займацца на майстар-класе», — папярэджвае Кацярына Якаўлеўна.

Каміла НАВІНКІНА

радзіннае

Адчуць сэрца Палесся

20 жніўня пачынаецца VII Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся». Месца падзей — аграгарадок Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Тэма — «Палесскі кірмаш» — увасобіць светапогляд палешукоў, паменшаны варыянт сусвету.

Арганізатары маюць на мэце прыцягнуць увагу да рэгіёна і заахвоціць жыхароў Беларусі пазнаёміцца з цудоўным краем. Палессе — больш чым проста гаворкі і заняткі, падкрэсліла Анастасія Ласенка, начальнік аддзела культурна-асветніцкай дзейнасці Гомельскага аблвыканкама.

Неабходнасць развіцця турызму і вывучэння гістарычных традыцый палешукоў адзначыў і Уладзімір Андрыевіч, начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

— «Кліч Палесся» адбываецца раз на два гады. Мы ўпэўнены, што з 2020 года нам ёсць чым здзівіць і зацікавіць гасцей, — перакананы галоўны рэжысёр фестывалю Аляксандр Бандарэнка.

Цэнтральнай падзеяй арганізатары абяцаюць пошукі «сэрца Палесся». Згодна з мясцовымі легендамі, той, хто знойдзе яго, стане шчаслівым.

Больш за 50 аматарскіх калектываў з Беларусі, каля 10 з Расійскай Федэрацыі, прафесійныя выканаўцы беларускай эстрады на галоўнай сцэне не пакінуць абыякавымі. Сярод лакацый — дзве дадатковыя сцэны, дзіцячыя пляцоўкі, лакацыя, прысвечаная году гістарычнай памяці… Адбудуцца конкурс на самага моцнага палешука, конкурс прыгажосці «Палесская прыгажуня». Вечар завершыцца феерверкамі, дыскатэкай ад гомельскіх калектываў.

Яна ЦЭГЛА

надзённае

Эмоцыі вызначаюць форму

Днямі ў галоўным корпусе Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў у Мінску па адрасе Някраса, 3 адкрылася выстаўка жывапісу Валянціна Нуднова «Цела Вады». Назву экспазіцыі падарыла пенталогія жывапісца, створаная ім на працягу 2019—2022 гадоў. Мэта выставачнага праекта — даць наведвальнікам уяўленне аб тым творчым шляху, які пераадолеў мастак, аб тых падзеях, якія адбыліся з ім падчас руху.

Паводле прызнання самога аўтара, словазлучэнне «Цела Вады» — гэта «хутчэй, гульня слоў, пошук аналогій у вызначэнні разнастайных з'яў». Вада, такім чынам, паўстае ў першую чаргу фізічнай субстанцыяй, якая не мае ўласнага «зафіксаванага», дакладна акрэсленага цела. Хаця вада і не мае сваёй формы, яна, тым не менш, здольна прымаць форму любога аб'екта. Працэс гэты блізкі да працэсу фарміравання, распаду і развіцця формы ў абстрактным мастацтве.

У работах пад назвай «Цела Вады» аўтар імкнецца раскрыць цесную сувязь паміж эмоцыяй і формай, прадэманстраваць, «як форма ўплывае на эмоцыю, і наадварот — як эмоцыя дыктуе пэўную форму».

Пры гэтым пад «формай» маецца на ўвазе не штосьці застылае, а менавіта працэс яе будаўніцтва. Па словах Валянціна Нуднова, яго работы павінны ўспрымацца «як эстэтычная структура», «ігра добрага джазавага калектыву», імправізацыя, дзе тэма пераменлівая.

Каміла НАВІНКІНА

Няпросты шлях да гармоніі

У зале беларускай літаратуры НББ распачалася выстаўка пад назвай «Праз пакуты — да шчасця», прымеркаваная да стагоддзя з дня нараджэння драматурга, празаіка і публіцыста Алеся Махнача (1922—2001).

Алесь Махнач належыць да пакалення пісьменнікаў, чый шлях у творчасці выкрышталізоўваўся пад уздзеяннем нялёгкіх, але гераічных падзей Вялікай Айчыннай вайны. У чэрвені 1941 года сярод абаронцаў Брэсцкай крэпасці, быў цяжка паранены і ўзяты ў палон. Пасля вызвалення з канцлагера ў 1945 годзе лячыўся ў ваенных шпіталях, атрымаў інваліднасць.

Экспазіцыя дэманструе жанравую разнастайнасць літаратара. Многія яго творы трапілі пад вокладку калектыўных зборнікаў, іншыя выходзілі асобнымі кнігамі, а таксама ў перыядычных выданнях. Да ўвагі наведвальнікаў — «Драматычныя мініяцюры», «Да пары збан ваду носіць…», «Усе ідуць у нагу», «Мы будзем жыць», «Дзеці крэпасці», «Няхай красуе жыццё», «Камандзір Усходняга форта», а таксама творы з серыі «Ведаць свой край Беларусь» — краязнаўчыя нататкі «Нізок» і «Забалацце».

Асобны раздзел выстаўкі прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху Алеся Махнача. Наведвальнікаў тут чакаюць да 29 верасня.

Аліса БРАТКА

«ЛіМ»-люстэрка

Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» і дзяржаўны музей «Смаленская крэпасць» падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве. Падзея адбылася ў рамках форуму «Культурная прастора Расіі і Беларусі як аснова ідэалогіі Саюзнай дзяржавы», паведамляе БелТА. Да гэтай падзеі было прымеркавана адкрыццё выстаўкі «Смаленская крэпасць у артэфактах бібліятэк і архіваў Саюзнай дзяржавы», якая размясцілася ў выставачнай зале мемарыяльнага комплексу «Музей вайны — тэрыторыя міру». Праект падрыхтаваны пры падтрымцы Міністэрства культуры Расіі і абагульняе папярэднія вынікі сумеснага расійска-беларускага праекта аб гісторыі найбуйнейшай мураванай крэпасці свету — Смаленскай крапасной сцяны. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 30 унікальных чарцяжоў, фатаграфій і пісьмовых крыніц XVII—XX стагоддзяў з дзяржаўных расійскіх і беларускіх архіваў і бібліятэк.

Міжнародны дзіцячы конкурс «Музыка надзеі» пройдзе з 12 да 16 снежня ў Гомелі. Як перадае БелТА, конкурс адбудзецца ў намінацыі «Фартэпіяна». У мерапрыемстве могуць прымаць удзел навучэнцы дзіцячых школ мастацтваў, сярэдніх школ, гімназій, гімназій-каледжаў мастацтваў Беларусі і замежных дзяржаў. Творчае спаборніцтва праводзіцца ў трох узроставых групах: малодшая (ад 8 да 10 гадоў уключна), сярэдняя (ад 11 да 13 гадоў уключна) і старэйшая (ад 11 да 13 гадоў уключна). Пераможцы змогуць быць залічанымі без уступных экзаменаў ва ўстановы адукацыі ў сферы культуры. Удзельнікі з Беларусі, якія прайшлі адборачныя туры, а таксама замежныя грамадзяне павінны накіраваць заяўку для ўдзелу ў заключным этапе да 1 лістапада. Арганізатарамі мерапрыемства выступаюць Міністэрства культуры і Гомельскі абласны выканаўчы камітэт.

Беларусь на конкурсе маладзёжнай песні фестывалю «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» прадставяць восем выканаўцаў, перадае БелТА. Адборачны тур прайшоў 16 жніўня ў Маладзёжным тэатры эстрады. Усяго ў барацьбу за пуцёўку на конкурс уступілі 17 канкурсантаў. Кожны ўдзельнік прадставіў дзве песні, адна з якіх раскрывала тэмы любові да Радзімы, роднага краю, подзвігу народа, а другая адлюстроўвала сучасныя маладзёжныя тэндэнцыі. Песні выконваліся на рускай і беларускай мовах, у якасці выключэння дазвалялася выкананне адной з песень на нацыянальнай мове спевака. У выніку фіналістамі сталі Вольга Булай, Ілья Пракаповіч (*Martwin*), Мікіта Залеўскі, Карына Ромыш, Лізавета Галеева, Маргарыта Шыбаева, Аліна Бурачэўская і Андрэй Кот. У якасці рэзервовых удзельнікаў адабраны Валерыя Мікалаева і Вікторыя Гневышава. Па ініцыятыве Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі з 14 да 19 верасня на тэрыторыі Смаленскай вобласці пройдзе 15-ы фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву».

Персанальная выстаўка члена Саюза мастакоў Малдовы і Міжнароднай асацыяцыі мастакоў, заслужанага мастака Малдовы Вячаслава Ігнаценкі «Знойдзеш Бацькаўшчыну блізка!» працуе ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. «Вячаслаў Міхайлавіч нарадзіўся ў вёсцы Карпаўка над Сожам, а дзіцячыя гады яго прайшлі ў вёсцы Пярэдзелка, што на правым беразе Дняпра, — расказваюць арганізатары. — Яшчэ з маленства, захоплены прыгажосцю родных ваколіц, ён пачаў маляваць, а яго першым настаўнікам і крытыкам быў бацька, які выкладаў маляванне і чарчэнне. Пераехаўшы пасля службы ў армію ў Мінск, Вячаслаў Ігнаценка ўдасканальваў сваё майстэрства, займаючыся ў вольны час у студыях вядомых беларускіх мастакоў Сяргея Каткова і Віталя Цвіркі, а прафесійную адукацыю атрымаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, які закончыў у 1983 годзе». Пасля завяршэння вучобы разам з сям'ёй мастак пераехаў у Кішынёў. З 1984-га ўдзельнічае ў рэспубліканскіх і міжнародных выстаўках. Каля 60 персанальных зладжана ў розных краінах свету. Цяперашняя працуе да 3 верасня.

Віртуальную выстаўку «Партрэт франтавога сабакі» размясціў на сваім сайце расійскі Музей Перамогі (Масква). У электронную экспазіцыю ўвайшлі работы беларусаў, інфармуе БелТА. Усяго прадстаўлена больш за 2,5 тыс. малюнкаў удзельнікаў міжнароднага конкурсу аб подзвігах сабак. Гледачы могуць убачыць работы аб чатырохногіх героях часоў Вялікай Айчыннай вайны — сабакахсанітарах, падрыўніках, сувязістах і інш. Сярод мастакоў — як зусім маленькія, маладыя жывапісцы, так і майстры. Творы прыслалі мастакі з 79 рэгіёнаў Расіі. На конкурс таксама паступілі малюнкі з Японіі, Казахстана, Малдовы, Узбекістана і іншых краін. Па выніках народнага галасавання будуць выбраны пераможцы намінацыі «Прыз глядацкіх сімпатый». Акрамя таго, журы выбера пераможцаў і лаўрэатаў у пяці ўзроставых катэгорыях: 6—8 гадоў, 9—11 гадоў, 12—14 гадоў, 15—17 гадоў і дарослыя. Прадугледжаны і спецыяльныя прызы.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

На памяць ад класіка: невядомыя інскрыпты песняра

У гісторыі нашай краіны столькі выбітных асоб, чые імёны мы павінны ведаць і шанаваць. Год Гістарычнай памяці для гэтага — добрая нагода. Сярод іх пачэснае месца займае класік беларускай літаратуры, народны паэт Беларусі Якуб Колас. Яго ўнёсак у развіццё беларускай літаратуры, навукі, культуры складана пераацаніць. Творчай спадчыне паэта прысвечана вялікая колькасць артыкулаў, даследаванняў, дысертацый. Здаецца, што чакаць новых адкрыццяў у галіне коласазнаўства не выпадае. Але часам знаходкі радуюць даследчыкаў жыцця і творчасці беларускага песняра.

З фондаў музея Якуба Коласа.

Якуб Колас. 1930-я гг.

Якуб Колас — непераўзыдзены мастак слова, адзін з найлепшых прыродаапісальнікаў у беларускай літаратуры. Ён вядомы нам як аўтар паэм «Новая зямля» і «Сымон-музыка», трылогіі «На ростанях», аповесцей «На прасторах жыцця» і «Дрыгва», мудрых і філасофскіх «Казак жыцця». Але ў творчай скарбонцы аўтара былі і цудоўныя творы для маленькіх чытачоў. З-пад яго пяра выйшлі вершаваныя апавяданні «Савось-распснік» і «Рак-вусач», паэма для дзяцей «Міхасёвы прыгоды». У 1934 годзе апошняя была адзначана на конкурсе найлепшых мастацкіх твораў для дзяцей. 31 сакавіка газета «Літаратура і мастацтва» паведаміла, што сярод 30 пададзеных на конкурс твораў адзначаны 11, сярод якіх трэцяй прэміяй — паэма Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды». Гэтая кніга спрыяла наладжванню сяброўскіх кантактаў Якуба Коласа з адным з самых вядомых рускіх дзіцячых пісьменнікаў — Самуілам Якаўлевічам Маршаком.

Хто не чытаў твораў Самуіла Маршака ў дзяцінстве? Яго «Дванаццаць месяцаў», «Багаж», «Кошчын дом» вядомы амаль кожнаму. Але не ўсе ведаюць, што Якуб Колас і Самуіл Якаўлевіч Маршак нарадзіліся ў адзін дзень і маглі б быць ледзь не землякамі.

Самуіл Маршак нарадзіўся 3 лістапада 1887 года ў Варонежы ў яўрэйскай сям'і. Яго бацька, Якаў Міронавіч Маршак (1855—1924), быў ураджэнцам Койданава, што недалёка ад Стоўбцаў, працаваў майстрам-тэхнікам на заводах, маці, Яўгенія Барысаўна Гітэльсон (1867—1917), ураджэнка Віцебска, была хатняй гаспадыняй. Стаўбцоўскі край — малая радзіма Якуба Коласа, беларускі паэт нарадзіўся 3 лістапада 1882 года ў Акінчыцах.

У 1893 годзе сям'я Маршака пераязджае ў Віцебск, у 1894-м — у Пакроў, у 1895-м — у Бахмут, у 1900 годзе — у Астрагожск. У 1899—1906 гадах будучы пісьменнік вучыўся ў Астрагожскай, 3-й Пецярбургскай і Ялцінскай гімназіях. У Астрагожскай гімназіі настаўнік славеснасці прывіў Маршаку любоў да класічнай паэзіі, заахвочваў яго першыя літаратурныя спробы. Адзін з паэтычных сшыткаў Маршака трапіў у рукі Уладзіміра Васільевіча Стасава, вядомага рускага крытыка і мастацтвазнаўцы, які прыняў гарачы ўдзел у лёсе юнака. З дапамогай Стасава Самуіл пераязджае ў Пецярбург і вучыцца ў адной з найлепшых гімназій. У 1904 годзе ў доме Стасава Маршак знаёміцца з Максімам Горкім, які паставіўся да яго з вялікай цікавасцю і запрасіў на сваю дачу ў Ялце, дзе малады пісьменнік жыў у 1904—1906 гадах. У канцы верасня 1912 года Самуіл Маршак адправіўся ў Вялікабрытанію, дзе вучыўся спачатку ў палітэхнікуме, затым — у Лонданскім універсітэце (1912—1914). Падчас канікул шмат падарожнічаў пешшу па Англіі, слухаў англійскія народныя песні. Ужо тады пачаў працаваць над перакладамі англійскіх балад.

У 1934 годзе Маршак удзельнічае ў I Усесаюзным з'ездзе савецкіх пісьменнікаў, выступае з дакладам аб дзіцячай літаратуры, абіраецца членам праўлення СП СССР. На гэтым жа з'ездзе прысутнічае і Якуб Колас, выступае з прамовай «Пути белорусской литературы». Верагодна, што менавіта там адбылася першая сустрэча пісьменнікаў. А ў хуткім часе беларускі паэт дасылае Маршаку сваю кнігу «Міхасёвы прыгоды». У лісце да сябра і перакладчыка Сяргея Гарадзецкага ад 16 лістапада 1935 года Якуб Колас пісаў: «За письмо большое спасибо. Твоей оценкой моей детской книги я горжусь. Писал мне о ней и Маршак. Дал очень хорошую оценку. Он сказал: "Книга написана большим мастером и подлинным поэтом. Поздравляю ребят, для которых написана книга"». Самуіл Маршак і сапраўды даслаў Коласу ліст, 5 кастрычніка 1935 года ён пісаў: «Дорогой тов. Колас! От всей души благодарю Вас за присылку мне Вашей прекрасной книги для детей "Міхасёвы прыгоды". Поздравляю тех ребят, которым попадет в руки книга, написанная большим мастером и подлинным поэтом».

Якуб Колас і Самуіл Маршак сустракаліся не раз на з'ездах пісьменнікаў у Маскве, а таксама падчас адпачынкаў у падмаскоўным санаторыі «Барвіха».

У лісце да П. У. Броўкі ад 16 сакавіка 1949 года Якуб Колас пісаў: «З 11-га III я гібею ў "Барвісе". Не таму, што Барвіха — гнілая мясціна, а таму, што я старая псіна. Не магу пахваліцца сваім здароўем. У бальніцы я лепей адчуваўся, чым тут. У "Барвісе" я нажыў сабе кашаль, якога не было ў Маскве… Будынак санаторыя і сам санаторый найлепшыя ў свеце, але ўсё ж у Балачанцы мне было б лепей: там няма такіх скразнякоў, як тут. Вось яны і залажылі мне грудзі… З маскоўскіх паэтаў тут адпачывае Маршак». Якуб Колас цяжка захварэў, праходзіў лячэнне ў крамлёўскай бальніцы, пазней быў накіраваны на рэабілітацыю ў Барвіху. Аб сустрэчах з Маршаком пясняр пісаў свайму сябру і перакладчыку Яўгену Мазалькову: «Здесь отдыхает С.Я. Маршак. Я подарил ему "Хату рыбака". Он мне говорил, что Ваши переводы самые лучшие, что, не заглядывая в оглавление, он безошибочно узнает главы, переведенные Вами».

Дзякуючы праекту Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа «Ад усяго сэрца, ад усёй душы: інскрыпты Якуба Коласа на кнігах», які рэалізоўваецца на працягу ўсяго юбілейнага года пры падтрымцы фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, скан гэтага інскрыпта быў атрыманы і друкуецца ўпершыню: «Дорогому, любимому поэту, Самуилу Яковлевичу Маршаку, прекрасной души человеку, на память от Якуба Коласа. Борвиха. 20 III 1949 г.» Кніга «Хата рыбака» захоўваецца ў прыватным архіве нашчадкаў рускага пісьменніка.

Развітальным падарункам Якубу Коласу сталі «Сонеты Шекспира в переводах С. Маршака» з цёплым дарчым надпісам: «Чудесному человеку и замечательному поэту Якубу Коласу с дружеским приветом С. Маршак. Борвиха. 6 апреля 1949 г.». У дзень ад'езда Коласа з санаторыя, 8 красавіка, пастановай Савета Міністраў беларускаму паэту была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР другой ступені за паэму «Рыбакова хата». Некалькі дзён Якуб Колас праводзіць у гасцініцы «Масква», а 10—11 красавіка выязджае ў Мінск, з якім так доўга быў разлучаны з-за цяжкай хваробы.

«Хата рыбака» не адзіная кніга, падараваная Коласам Маршаку. У асабістай бібліятэцы рускага пісьменніка захоўваецца выданне «Новай зямлі» на рускай мове, кніга выйшла ў Мінску ў 1949 годзе. На асобніку аўтар пакінуў наступны дарчы надпіс: «Дорогому Самуилу Яковлевичу Маршаку. Якуб Колас. 13. II 1951 г.». Аўтограф таксама друкуецца ўпершыню. У канцы 1950 — пачатку 1951 года Якуб Колас зноў цяжка хварэе, лечыцца ў Крамлёўскай бальніцы, затым адпачывае ў санаторыі пад Масквою. І гэтая кніга была падаравана ў «Барвісе», дзе адпачывалі абодва пісьменнікі.

2 сакавіка 1951 года Самуіл Маршак пісаў Якубу Коласу: «Дорогой Константин Михайлович. Вернулся я из Борвихи и вскоре опять прихворнул. Поэтому еще не успел поблагодарить Вас за милый подарок — поэму "Новая земля". Большое Вам спасибо за память и за отличную книгу». Разам з лістом Самуіл Маршак даслаў Коласу кнігу «Роберт Бёрнс в переводах Самуила Маршака» з наступным дарчым надпісам: «Дорогому Якубу Коласу — С. Маршак. Москва, 2 марта 1951 г.».

Кожная выяўленая кніга з аўтографам Якуба Коласа адкрывае невядомыя старонкі жыцця паэта, дазваляе даведацца аб асобах з яго акружэння, раскрывае гісторыю кантактаў, стасункаў і сяброўскіх зносін пісьменніка з рознымі людзьмі. Спадзяюся, што яшчэ многа такіх адкрыццяў чакае нас наперадзе.

31 сакавіка газета «Літаратура і мастацтва» паведаміла, што сярод 30 пададзеных на конкурс твораў адзначаны 11, сярод якіх — трэцяй прэміяй паэма Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды». Гэтая кніга спрыяла наладжванню сяброўскіх кантактаў Якуба Коласа з адным з самых вядомых рускіх дзіцячых пісьменнікаў — Самуілам Якаўлевічам Маршаком. Хто не чытаў твораў Самуіла Маршака ў дзяцінстве? Яго «Дванаццаць месяцаў», «Багаж», «Кошчын дом» вядомы амаль кожнаму. Але не ўсе ведаюць, што Якуб Колас і Самуіл Якаўлевіч Маршак нарадзіліся ў адзін дзень і маглі б быць ледзь не землякамі.

Васіліна МІЦКЕВІЧ,
галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа

Цудоўна, што 2022-гі аб'яўлены Годам гістарычнай памяці. Не менш радуе імкненне пісьменнікаў асвятляць даўнія падзеі. Справядліва гаворыцца аб важкім унёску ў гэтую важную справу Уладзіміра Караткевіча. Шкада толькі, што часам у цяні застаюцца (на жаль, іх не так і шмат) пачынальнікі гістарычнага жанру ў нашай літаратуры. Адна з прычын — неперавыданне іх твораў. Яскравы прыклад — апавяданне «Міроніхін курган» Барыса Мікуліча. Стылізаванае пад легенду, яно ў 1927 годзе было змешчана ў літаратурным дадатку «Вясна» да бабруйскай акруговай газеты «Камуніст», а праз некаторы час яго перадрукаваў часопіс «Маладняк». Выпадак, пагадзіцеся, нячасты. Як і тое, што такой увагі заслужыў дэбютны твор Барыса Мікуліча, якому споўнілася ўсяго 15 гадоў. Спяшаўся жыць, спяшаўся пісаць. Як у духу свайго часу, так шмат у чым і абганяючы яго.

Барыс Мікуліч.

Спяшаўся жыць, спяшаўся тварыць

Аптымізм — пазайздросціш

Родам Барыс Мікуліч з Бабруйска, нарадзіўся 19 жніўня 1912 года ў сям'і мясцовага фельчара, які цікавіўся літаратурай. Маці таксама не была абыякавай да яе. Бацькі мелі багатую бібліятэку. Гэта, як і тое, што ў сям'і стала традыцыяй кожнаму ў дзень нараджэння абавязкова дарыць кнігу, паспрыяла таму, што рана захапіўся чытаннем. Аднак сярод сямейнікаў вылучаўся шырынёй інтарэсаў. Знаёміўся не толькі з захапляльнымі выданнямі, але і з «дарослымі». Навуковыя таксама любіў пачытаць. Ды і пра розныя прафесіі, асабліва сучасныя. А свае першыя апавяданні напісаў яшчэ другакласнікам.

Была ў Барыса і яшчэ адна важная якасць. Хоць рана напаткала гора — калі хлопцу споўнілася сем гадоў, ад заражэння крыві памёр бацька, а праз восем не стала маці, — з'яўляўся аптымістам. З малодшай сястрой Марыяй у месяц атрымліваў усяго пятнаццаць рублёў пенсіі, але на лёс ніколі не скардзіўся. Не паменшала аптымізму і пасля таго, як газета «Звязда» апавяданне «Міроніхін курган» раскрытыкавала. Выразаў гэтую рэцэнзію і на ёй напісаў: «А ўсё-такі я буду пісьменнікам».

Упэўненасці пабольшала, калі ў 1929 годзе ўладкаваўся ў газету «Камуніст». Атмасфера ў ёй была настолькі творчая, якой і некаторыя цяперашнія рэдакцыйныя калектывы могуць пазайздросціць. Там працавалі і творчыя аднадумцы: галоўны рэдактар Міхась Лынькоў, Рыгор Суніца (псеўданім яго брата), Хвядос Шынклер. З апошнім пасябраваў. Розніца ў дзевяць гадоў перашкодай не стала. Зблізіла любоў да літаратуры і жаданне пісаць.

Тагачасная літаратурная моладзь, як вядома, вылучалася вялікай актыўнасцю, але Барыс Мікуліч пераўзышоў ці не ўсіх. За пяць гадоў выдаў ажно сем кніг: «Удар», «Чорная Вірня» (абедзве 1931), «Наша сонца», «Ускраіна» (абедзве 1932), «Дужасць» (1934), «Яхант» (1935), «Дружба» (1936). Няблага заявіў аб сабе і як перакладчык. Разам з Р. Бахтай па-беларуску пераўвасобіў раман Арцёма Вясёлага «Краіна родная», самастойна — аповесць Уладзіміра Лідзіна «Магіла невядомага салдата». Рэгулярна выступаў у друку з рэцэнзіямі і артыкуламі.

Большасць апавяданняў, што склалі змест яго першай кнігі, расказвалі пра барацьбу за выкананне планаў, пра аўралы і штурмы, пра выкрыццё руніцёраў і сабатажнікаў. Гэтым і жыла ў той час літаратура, асвойваючы рабочую тэматыку. Сябар Барыса Мікуліча, а пасля вядомы паэт Сяргей Грахоўскі, згадваючы гэты зборнік, адзначыў схільнасць маладога аўтара да экспрэсіўна-эмацыянальнага ўспрымання рэчаіснасці. Звярнуў увагу і на афармленне: «На мяккай цаглянага колеру вокладцы бялелі доўгія літары "ўдар". Амаль на кожнай старонцы ў рамачках стракацелі аб'явы, заклікі, звароты, выклікі на сацыялістычнае спаборніцтва».

Часам чалавечае — чужое

Толькі першая кніга — гэта першая кніга. Майстэрства, сваё бачанне жыцця пісьменніку амаль заўсёды неабходна падмацоўваць новымі творамі. Пра сябе як пра самабытнага пісьменніка Барыс Мікуліч заявіў аповесцю «Чорная Вірня». Ды гэта відавочна сёння. Крытыка ж абрынулася з папрокамі, што ў творы падзеі калектывізацыі выкарыстоўваецца толькі як фон. Усё зводзілася да таго, што, маўляў, не змог праўдзіва расказаць пра абнаўленне вёскі. Але якраз тое, што некалі ставілася яму ў віну, і ёсць адыход ад традыцыйнага, схематычнага, ілюстрацыйнага ў паказе калектывізацыі.

Галоўны герой аповесці, камуніст Брагін, у той час, калі многія былі ап'янелыя жаданнем руйнаваць на сяле старыя межы, паскорана пераходзіць да калектыўнага гаспадарання, ставіўся да гэтага цвяроза. Разумеў, што нельга з наскоку рассякаць трывалыя вузлы. Адчуваючы, што сакратар райкама партыі Серафімаў празмерна рашучы, заяўляе: «Я не бачу таго, каб тая ж самая гаротная Аксіння, у падзёртай спадніцы, з галодным дзіцем на знясіленых грудзях, прыйшла да выніку: трэба раскулачыць Каратая. Маса людзей яшчэ не ўзнята, не мабілізавана вакол пытання калгаснага будаўніцтва. Патрэбны час для гэтага».

Мабілізаваць масу — натуральна, з шэрагу тагачаснай рэчаіснасці. У гэтым Брагін не ідзе далей сваіх апанентаў, але ён, як нямногія, разумеў: прымусовасць жаданых поспехаў не дасць. Аповесць «Чорная Вірня» стала творам, звернутым у дзень заўтрашні, яна ў многім абагнала свой неспакойны і складаны час.

Гэта не значыць, што Барыс Мікуліч цалкам пазбягаў ідэалізацыі рэчаіснасці. Напрыклад, у аповесці «Наша сонца» ў многім прыхарошаны вобраз камсамольскага лідара Анатоля Шастакова. Хоць, зноў жа, у гэтым вобразе — тыповае для свайго часу. Шастакоў цалкам падначальвае сваё жыццё рэвалюцыйнай ідэі. Перафразуючы вядомыя словы, можна сказаць, што ўсё чалавечае яму чужое. Але для 1930-х гадоў падобныя людзі і патрэбны былі. Невыпадкова аповесць выклікала вялікую зацікаўленасць у моладзі. Юнакі і дзяўчаты зачытваліся ёю, абмяркоўвалі дзеянні Анатоля Шастакова на камсамольскіх сходах. Барыс Мікуліч быў перакананы, што «сацыяльную маладосць і дужасць можа знайсці толькі той, хто аддана працуе на рэвалюцыю, хто бярэ актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве». Гэтым словам — «Дужасць» — назваў і адзін са сваіх твораў.

Самакрытычнасць — адзнака таленту

«Працавітасць Мікуліча, — успамінаў Сяргей Грахоўскі, — была сапраўды бальзакаўскай». Малады, прыгожы, ён хутка знаходзіў агульную мову з літаратарамі, станавіўся для іншых свайго роду сілавым полем. У 1935 годзе разам з Віталём Вольскім, Эдуардам Самуйлёнкам, Уладзімірам Кавальскім, Міколам Хведаровічам пабываў у Грузіі. Вынікам паездкі стала аповесць «Дружба». Яшчэ адну — «Скрыпка» — здаў у часопіс «Полымя» галоўнаму рэдактару Міхасю Лынькову. Да яе паставіўся даволі самакрытычна: «Аповесць была значна горшая за "Дружбу", але мела кампазіцыйныя і моўныя перавагі перад "Дружбай" — вынік спакойнай уседлівасці». Такую ацэнку ёй, ненадрукаванай, даў толькі 13 верасня 1946 года. Пра гэта чытач даведаўся ажно праз 41 год, калі часопіс «Нёман» (1987, № 3) змясціў першую частку «Аповесці для сябе» Барыса Мікуліча.

З 1937 года ў яго пачаліся няпростыя жыццёвыя дарогі. Аднак, калі з'яўлялася магчымасць, працягваў пісаць. У аповесцях «Цяжкая гадзіна» і «Палеская аповесць» звярнуўся да падзей Вялікай Айчыннай вайны. Пэўным чынам яны закранаюцца і ў «Жыццяпісе Вінцэся Шастака». Яшчэ ў адной аповесці — «Зялёны луг» — асэнсоўваў аднаўленне разбуранай беларускай вёскі. Але гэтыя творы да яго набыткаў не аднясеш. Асноўная прычына — слабае веданне матэрыялу, пакладзенага ў іх аснову. Пісаў жа на падставе сведчання іншых людзей.

Не адпускала яго, як відаць па змесце рамана «Адвечнае», і мінулае. Раман — гэта па вызначэнні крытыкаў. Сам жанр гэтага твора вызначыў як аповесць. Хутчэй за ўсё збіраўся прадоўжыць працу. А завершаная была апублікавана толькі ў 1972 годзе («Полымя», № 8). Ды ад жанравага вызначэння сутнасць не мяняецца: твор атрымаўся.

Істотна і тое, што, пішучы пра Айчынную вайну 1812 года, правёў паралель паміж тым, што адбывалася сто гадоў назад і нападам фашыстаў на Савецкі Саюз. Напалеон і Гітлер у яго разуменні — аднолькавыя захопнікі, якія, кіруючыся сваімі імперскімі амбіцыямі, замахваліся на свабоду іншых народаў.

Развітанне: героя і аўтара

Сярод апошніх твораў Барыса Мікуліча асабліва вылучаецца аповесць «Развітанне». Не толькі з-за сваёй мастацкай дасканаласці, але і таму, што галоўны герой яе — Максім Багдановіч. Як вядома, перад паездкай на лячэнне ў Крым паэт шэсць месяцаў кватараваў у Мінску ў Змітрака Бядулі. Пішучы гэты твор, Барыс Мікуліч як бы адштурхоўваўся ад апавядання Самуіла Яфімавіча «Страцім-лебедзь», а той, у сваю чаргу, ад аднайменнага багдановічаўскага твора-развітання, твора-легенды. Аднак, калі ў аснову апавядання пакладзены толькі дзень, у які і нарадзіўся гэты шэдэўр, то ў аповесці, па сутнасці, прасочваецца ўвесь перыяд знаходжання Максіма Багдановіча ў Мінску перад развітаннем з Радзімай.

«Развітанне» — гэта не дакументальна-мастацкі, а менавіта мастацкі твор. У ім пададзена не столькі тое, што было, колькі магчымае. Прынамсі, Максім не наведвае, як у сапраўднасці, Пушкінскую бібліятэку, дзе знаёміўся з фальклорнымі даследаваннямі. Ён шмат ходзіць па горадзе. Адзінота, хай сабе і за кнігай, яго гняце, таму хочацца больш быць на людзях. Зазірае і на гарадскія ўскраіны, на прыродзе сустракае ўзыход новага дня. Занепакоены Змітрок Бядуля нагадвае яму, што гэта шкодна для яго падарванага здароўя. У адказ гучыць: «Я не хаджу піць у кампаніі або на спатканне з каханай. Смешна, але прызнаюся, што ў мяне нават не было каханай жанчыны, не было кахання… А не хадзіць я не магу… пячэ тут, на сэрцы… я так хутчэй папраўляюся… Я хаджу на спатканне з Беларуссю. Я знаю, што гэтае спатканне апошняе, што гэта — развітанне… І я не магу не хадзіць».

Даючы свабоду творчай фантазіі, аўтар «Развітання» знаёміць паэта з дзяўчынай. Яна не толькі чытала яго «Вянок». Яе і Веранікай завуць. Але падобную кніжнасць яму даруеш. Іншая справа, калі па яго волі Максім становіцца прыхільнікам бальшавікоў. Гэта сам апавядальнік, зведаўшы столькі несправядлівасці, не растраціў веры ў справядлівасць, дабро. Быў перакананы, што беззаконне робіцца толькі на месцах. Пісаў ліст Сталіну, а калі ў 1946 годзе з'явілася чарговае выданне кнігі «История ВКП(б). Краткий курс», прыдбаў яе.

Назва аповесці гучыць сімвалічна. Не здагадваючыся пра гэта, Барыс Мікуліч і сам развітваўся з Беларуссю. Яго сэрца спынілася раптоўна ў пяць гадзін раніцы 17 чэрвеня 1954 года за дыспетчарскім сталом Машукоўскага леспрамгаса Тасеўскага раёна Краснаярскага краю.

Апошнія радкі яго «Аповесці для сябе», пазначаныя 20 чэрвеня 1948 года, звернуты да ўсіх, каго ён любіў як чалавек, як пісьменнік і як грамадзянін: «І так, стаўлю кропку. "Аповесць для сябе"? Не! Я хачу, каб гэты канспект "аповесці" быў для ўсіх, каб яны любілі і цанілі жыццё і каб не развіваліся з марай!..

Бывайце, мае адзінокія гадзіны, пакуты, сумненні. Я пачынаю новае жыццё ці…»

Перад гэтым жа: «Ува мне велізарная энергія. Вобразы ненапісаных кніг туляцца вакол мяне, сняцца мне, са мною ходзіць побач прыгожая мая мара, якая падтрымлівала мяне і ў ветраным новасібірскім стэпе, і ў марозы Краснаярска, і ў гразі этапаў, і ў вугальным пыле… Яна ўсміхалася мне на чарнаморскім узбярэжжы, на домнах Магніткі, на праспекце Сталіна ў Краснаярску, на Дварцовай плошчы і на Астожанцы… Яна была і на беразе Гайны, і ў тайзе.

Няўжо ты пакінеш мяне цяпер, мая залатая сяброўка — мара?!»

Мара яго — рэвалюцыйная, асветленая — вяла праз усё жыццё. Быў перакананы: праўда пераможа. Гэта і надавала яму сілы жыць, пісаць творы. Найлепшыя з іх вартыя таго, каб быць вядомымі.

Змітро ВЯРЭНІЧ

Хлопчык-журавель і барсучок-цымбаліст

Апошнім часам у айчыннай дзіцячай літаратуры ўсё большае распаўсюджванне атрымлівае жанр казкі. З'яўляюцца як творы ўласна аўтарскія, так і з фальклорнымі матывамі. Радуе і тое, што сярод аўтараў шмат маладых пісьменнікаў, якія менавіта ў творчасці для хлопчыкаў і дзяўчынак знайшлі сваё прызванне. Аднак паспяхова пішуць для дзяцей і прызнаныя «дарослыя» пісьменнікі. Адзін з іх — Сяргей Давідовіч, новую кнігу якога «Дабром за дабро» Выдавецкі дом «Звязда» выпусціў напярэдадні 80-годдзя Сяргея Фёдаравіча.

Характэрна ўжо тое, што, прапануючы маленькім чытачам 18 казак, ён вуснамі галоўнага героя Трахіма адной з іх («Дзіва з дзіваў») выказвае сваё стаўленне да гэтага жанру: «Можна нават праводзіць своеасаблівы тэст на выяўленне людзей з жывой душой: чытае сталы чалавек казкі, значыць, душа ў яго жывая. Не чытае — лепш абысці такога за вярсту. Дзяцей правяраць не трэба — ва ўсіх іх душы светлыя і жывыя». Праўда, адзін з аднавяскоўцаў запярэчыў: «Ну, не чытаю я казак! Дык што, бегчы ад мяне?» — «Бегчы не трэба, — зрэагаваў Трахім. — А пашкадаваць не пашкодзіць, бо тваё маленства ў табе памерла. Старасць не рызыкуе падступацца да таго чалавека, у душы якога працягваюць гучаць галасы маленства… Вось толькі дзівосаў у сучасным жыцці ўсё менш і менш, а без іх галасы дзяцінства ў душы пачынаюць цішэць».

Дае Сяргей Давідовіч і адказ на тое, як пісаць казкі. Так якраз называецца адзін з твораў. Пісьменнік-пачатковец просіць вядомага пісьменніка-казачніка: «Навучыце вы мяне пісаць казкі! Колькі разоў ні браўся, колькі ні пачынаў — нічога не атрымлівалася. Разумею, што ў казцы павінны адбывацца нейкія цуды, штосьці незвычайнае, чароўнае, а дзе што браць — не ведаю». Пасля гэтага яны ідуць шукаць «цуды». Праходзяць жытнёвы палетак, узіраюцца ў неба, спыняюцца каля дзвюх бярозак. Да ўсяго гэтага пачатковец ставіцца спакойна, а то і абыякава (дарэчы, ёсць у кнізе казка «Абыякавіч»). Не разумее, што неабходна «глядзець, слухаць і ўспрымаць жыццё адкрытым сэрцам». Інакш казачнікам не бываць.

А вось Сяргей Фёдаравіч падобнымі якасцямі валодае. Дзякуючы гэтаму, дзеці, чытаючы яго казкі, і могуць зірнуць на саміх сябе як бы збоку. Зразумеюць, што адкрываецца немагчымае, калі пазнаеш нязведанае. Часам і выпадак падносіць такую сітуацыю, што неверагоднае становіцца рэальнасцю. Гэта і адбылося з Мацейкам, героем казкі «Хлопчык-журавель». Калі ён з бацькам запускаў змея, шнур, да якога прывязаў яго, моцна накруціў сабе на рукі. Таму разам са змеем хлопчык узняўся ў паветра. Уратаваў яго важак журавоў, якія адляталі ў вырай. У Мацейкі з'явіліся сапраўдныя крылы, і ён ператварыўся ў хлопчыка-жураўля. Уратавацца то ўратаваўся, а пасля…

У Сяргея Давідовіча нават заяц («Памаўза») такі, якога ні ў адной іншай казцы не напаткаеш. Ён «адпавядаў свайму імені — быў і сапраўды памаўзлівым. Не мінаў ніводнага агарода (вядома ж, чужога), ніводнай сядзібы, хоць Лісінай, хоць Воўчай і нават Мядзведзевай». Здолеў падмануць не толькі старога Макара, які злавіў яго ў агародзе, але і Мядзведзя, Ваўка, Лісу.

Адна з гэтых хітрух («Занадта хітрая Ліса») дамаглася зусім неверагоднага. Думала-думала і прыдумала: «А што, калі б мне… паспрабаваць абвесці вакол уласнага хваста сябе? Ідэя! Я такая разумная, такая хітрая, а раптам мне ўдасца быць яшчэ больш хітрай за сябе». І «сама сябе абвяла вакол абадранага свайго хваста…» Як? У гэтым і інтрыга.

А казка «Барсучок Піма» адметная ўжо выбарам галоўнага героя. Праўда, гэтых звяроў можна напаткаць у творах — як народных, так і аўтарскіх, але не так часта, як іншых лясных персанажаў. Праўда, і тут не абышлося без зайца. Аднак казка «спрацоўвае» дзякуючы ўдала знойдзенаму сюжэту. «Барсукі, як вядома, жывуць у норах. Яны вялікія чысцюлі. Сваё жытло яны ўтрымліваюць у бездакорным парадку і чысціні. Больш за тое, яны кожны год пашыраюць свае "апартаменты" — дакопваюць новыя норы, звязваюць іх між сабой хадамі. "Парадны" ўваход жытла яны старанна маскіруюць, як і патаемны запасны выхад. Адным словам — майстры».

Піма быццам не адрозны ад іншых барсучкоў. Толькі рана захацеў жыць адасоблена. Маці была супраць, але бацька паставіўся да гэтага спакойна: «Яго ж нара будзе побач. Па сутнасці, ён будзе жыць з намі, толькі ў сваім пакойчыку. Ён у нас разумненькі». Але неўзабаве адбылося нечаканае. Капаючы для сябе нару, Піма наткнуўся на жалезную скрыначку, а ў ёй была яшчэ адна, драўляная — «з круглымі дзіркамі зверху. Над дзіркамі нацягнуты драцінкі. На драцінках-струнках ляжалі дзве палачкі. Дзіва! Барсучок Піма пакратаў лапкай струны, і яны неяк дзіўна загучалі».

Найлепшы сябар Пімы заяц Скок патлумачыў, што гэта цымбалы. Ласуючыся морквай на агародах, бачыў, як на такім музычным інструменце іграў адзін дзядуля. Паспрабаваў Піма па падказцы Скока, няблага атрымалася. І тут чарговы нечаканы паварот у сюжэце. Калі Піма іграў каля нары, яго заўважылі браканьеры Хлыст і Хват. Схапілі бедалагу — і ходу. Вырашылі прадаць яго ў цырк…

Не буду далей расказваць, як усё адбывалася. І так зашмат увагі надаў аднаму твору. Скажу толькі, што гэта аказаліся цымбалы, на якіх некалі ў маленстве іграў той дзядуля, да якога Скок бегаў у агарод. Як яны трапілі да бабровай нары, можна даведацца, прачытаўшы казку «Барсучок Піма».

Пісьменнік-пачатковец просіць вядомага пісьменніка-казачніка: «Навучыце вы мяне пісаць казкі! Колькі разоў ні браўся, колькі ні пачынаў — нічога не атрымлівалася. Разумею, што ў казцы павінны адбывацца нейкія цуды, штосьці незвычайнае, чароўнае, а дзе што браць — не ведаю». Пасля гэтага яны ідуць шукаць «цуды». Праходзяць жытнёвы палетак, узіраюцца ў неба, спыняюцца каля дзвюх бярозак. Да ўсяго гэтага пачатковец ставіцца спакойна, а то і абыякава (дарэчы, ёсць у кнізе казка «Абыякавіч»). Не разумее, што неабходна «глядзець, слухаць і ўспрымаць жыццё адкрытым сэрцам». Інакш казачнікам не бываць.

Іншыя казкі таксама напісаны так, што, несумненна, не пакінуць маленькіх абыякавымі. Сімвалічная назва той, якая і дала кнізе назву. Пазнаёміўшыся з ёю, хлопчыкі і дзяўчынкі пераканаюцца, як «адна добрая справа <…> нарадзіла шмат новых добрых спраў». Адметнасць кнігі і ў тым, што Сяргей Фёдаравіч сам праілюстраваў яе.

Арцём ПІЛІПЧЫК

Дзіцячае чытанне

Як забег у кніжку кот

Заканчваецца лета, якое, спадзяёмся, многія правялі з добрай кнігай. Але ж чытанне — працэс бясконцы. У вялікай культурнай спадчыне шмат кніг класікаў і сучасных аўтараў, прысвечаных менавіта дзецям. Як вядома, з маленства пачынаецца пазнанне чалавекам свету і свайго месца ў ім. Праз кніжных герояў, іх учынкі, праз разуменне дабра і зла адбываецца станаўленне асобы.

Як сарыентавацца ў вялікім кніжным моры? Без чаго не абысціся? Якія кніжныя навінкі прапануюць сучасныя творцы?

Аб асаблівасцях дзіцячай літаратуры, тэндэнцыях яе развіцця, праблемах — аўтарская рубрыка «Дзіцячае чытанне» старшыні секцыі дзіцячай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі Алены Стэльмах.

У 2002 годзе Уладзімір Мазго пазнаёміў свайго чытача з новым героем — цікаўным, вясёлым катом Васілём, які стаў слынным мараходам. Кот вельмі спадабаўся дзецям, бо меў шмат прыгод і ў кожнай складанай сітуацыі не дрэйфіў, сухім выходзіў з вады.

І вось радасны Уладзімір Мінавіч паведамляе пра тое, што яго кот праз дваццаць гадоў вандроўкі па свеце вяртаецца на радзіму — у Беларусь. У хуткім часе ў выдавецтве «Беларусь» выходзяць «Казкі катамарахода». Але ж, як вядома, у кожнага пісьменніка ёсць свая творчая кухня, і таму ў Уладзіміра Мазго пытаюся:

— Адкуль узяўся кот?

Пісьменнік з уласцівай яму мяккай усмешкай на вуснах згадвае сваё дзяцінства:

— Я марыў стаць мараком, меў намер паступаць у мараходку. Але мае першыя спробы пяра — публікацыі вершаў у рэспубліканскай прэсе — падахвоцілі больш актыўна займацца літаратурай.

Звярнуць увагу на ката мяне прымусіў сын Андрэй. Летам ён адпачываў у бабулі ў вёсцы і калі я прыязджаў, то назіральны хлопчык у захапленні расказваў пра тое, што яго вабіла. Аб'ектам сімпатый сына быў кот Васіль.

Аднойчы мы ляжалі на печы, дзе ўладкаваўся і наш любімец. Задаволены кот пачаў мяўкаць, і мне падалося, што ён распавядае пра свае неверагодныя падарожжы, якія я пераказаў. Кот-смяльчак праплыў сотні міль, ледзь не трапіў да піратаў у палон, кружыў у снежным танцы з пінгвінамі, завітаў у госці да кіта…

Як піша Уладзімір Мінавіч: «А Васіль — герой рэальны, // Ён зусім не віртуальны». На гэтым аўтар мог бы паставіць кропку, але праз два дзесяцігоддзі зноў у пісьменніка ўсплылі ўспаміны пра ката. «Ваўку марскому захацелася дадому», — кажа У. Мазго. Так з'явілася паэма-казка «Вяртанне ката-марахода», герой якой нечым падобны на знакамітага выдумшчыка барона Мюнхгаўзена.

Кот, як сапраўдны патрыёт, цяпер падарожнічае па Беларусі. Як і той, хто доўгі час быў па-за межамі радзімы, кот наталяецца сваёй краінай. Яго чакаюць пушчы, рэкі і азёры… Праз свайго героя Уладзімір Мазго выказвае ўласную пазіцыю і перадае адчуванне кожнага беларуса: «Ён зямлёю ганарыцца, // Дзе меў гонар нарадзіцца».

Наогул, у беларускай літаратуры, як, між іншым, і ў сусветнай, вобраз ката вельмі распаўсюджаны. Пачынаючы ад вуснай народнай творчасці — калыханак, забаўлянак, казак, — да твораў сучасных аўтараў гэтая, найбольш блізкая да чалавека, жывёла заняла пачэснае месца сярод мастацкіх вобразаў, на якіх выхоўваецца асоба. Каток — залаты лабок, коцік-варкоцік, каток шэры — якімі толькі эпітэтамі не апісваюць хатніх любімцаў!

Напрыклад, у творчасці Міхася Пазнякова кот — інтэлегент. Ён чысцюткі, акуратны, своеасаблівы лекар.

Кранае сказ Кастуся Цыбульскага пра рудога ката, якога за тое, што краў бліны, звезлі далёка ад дома. А ён, небарака, вярнуўся назад, каб застацца каля роднага парога.

А вось у Маргарыты Прохар коткі жывуць у сучасным свеце і могуць валодаць камп'ютарам, здольны нават стварыць сваю інтэрнэт-сетку «Катавічок». Дзякуючы ёй яны вандруюць, знаходзяць сяброў, робяць новыя адкрыцці.

Уладзімір Мазго напрыканцы сваёй паэмы-казкі запэўнівае чытача: «Яшчэ нямала меў прыгод у Беларусі мараход». Значыць, гісторыі пра мурлыкаў працягваюцца…

Алена СТЭЛЬМАХ

Этымалагічныя эцюды*

З кнігі «След самаеда»

Варона, Воранава, Вароніна

Азёраў і рэк не бывае без берагоў, і людзі, селячыся на берагах, уводзілі іх у найменні сваіх паселішчаў. На нганасанскай мове бераг *бэрэ*, на энецкай *биз бар* (дзе *биз* — вада), на ненэцкай *вар*, калі глядзець на яго з сушы, і *я' вар*, *ид' вар* — калі з вады. Будзем сёння глядзець на яго з сушы. Ім атэстоўваюцца і гідронімы, і айконімы, вось некаторыя.

Варона: вёска ў Астравецкім раёне на рэчцы Сянканцы; Вароны: вёска ў Валожынскім раёне на Бярэзіне, у Віцебскім раёне на беразе возера Палонская; Варнакелі: вёска ў Воранаўскім раёне на беразе ракі Шальчы; Вароніна: вёска ў Жыткавіцкім раёне на беразе Прыпяці, у Клецкім раёне на сканалізаваным рукаве Лані, у Сенненскім раёне на рацэ Абалянцы, у Расонскім раёне на прыбярэжжы азёраў Чорненькага, Кожкі, Плішчаны; Варонка: вёска ў Шаркаўшчынскім раёне на рацэ Густатка; Варонкі: вёска ў Мёрскім раёне на рукаве ракі Авута; Варонча: вёска ў Карэліцкім раёне на рэчцы Карчоўцы; Воранаўшчына: вёска на Старым Рове ў Капыльскім раёне, і Воранаўшчына: вёска ў Полацкім раёне на прыбярэжжы возера Рудзёнкава; Воранава: гарадскі пасёлак на рацэ Жыжме, вёска ў Полацкім раёне на ўзбярэжжы Мяшчэцкага возера; Варняны: вёска ў Астравецкім раёне на беразе ракі Газоўкі; Варонічы: вёска ў Вілейскім раёне на рэчцы Рудні, у Зэльвенскім раёне на рэчцы Столцы, у Полацкім раёне на возеры Варонеч, у Пухавіцкім раёне на Пцічы, у Слонімскі раёне каля вытоку ракі Грыўды; Варанілавічы: вёска ў Пружанскім раёне на рэчцы Поплаве; Варанцэвічы: вёска ў Талачынскім раёне на рэчцы Іржэўцы і на рэчцы Няслуха з яе рукавамі вёска Варацэвічы, у найменні якой выпала суфіксальнае *н*. Ва ўсіх прыведзеных прыкладах яно прысутнічае, яно рэшткa самадзійскага паслялога *на*, што ў ненэцкай мове мае адпаведнікі *нина*, *ниня*, *ни'*, ці паслялога 'каля' (на ненэцкай *няна*), ці паслялога 'насупраць' (на ненэцкай *е"ня)*.

Вар' нина, *вар' ниня*, *вар' ни'*, *вар' няна* — так мелася б выглядаць аснова словаформаў айконімаў, што тут назваліся, калі б мы паспрабавалі іх рэстаўрыраваць, вяртаць у пачатак.

Усе гэтыя словаформы 'вароніныя' — прышпіленыя да назоўніка 'варона' і ўзятыя адно з тапанімікі Беларусі. А ёсць жа яшчэ і 'вераб'іныя', і 'ворныя', і 'верасовыя', і 'вярхоўныя' (так, *вархы* — прыбярэжны), у якіх, калі не ва ўсіх, то ва ўсякім разе ў шмат якіх, пры пільным разглядзе выявіцца *вар* — край, бераг. І сам бераг, як і рака, таксама можа мець сваё азначэнне альбо быць дапасаваным да азначэння: так у тапоніме Варапаева марфема *паё* — альха, так, у анлаўце тапонімаў Хварастань, Хварасцініна, Хварасцянка ў скарочаным варыянце прысутнічае марфема *хо* — бяроза.

Гук 'в' у ненэцкай мове губна-губны, такі самы, як 'у'нескладовае ў беларускай мове; натуючыся, у асобных выпадках ён раскладаецца на два гукі: найменні мястэчка Уварава на рацэ Варона, мястэчка Уваравічы на рацэ Уза сведчаць пра гэта.

Вар выступаў адным з асноўных маркераў мясцовасці, і людзі, што з адыходам ледавіка асвойвалі вызваленую прастору, пакідалі яго ўсюды, куды даплывалі і дзе спыняліся.

Гэтыя маркеры становяцца адзнакамі, якія прыводзяць да першапаходцаў і першапасяленцаў, да тых, хто іх тут і там пакінуў, — да самаедаў.

Заяц

На беларускай мове *заяц*, на рускай *заяц*, на ўкраінскай *заєць*, на польскай *zając*, на верхнялужыцкай *zajac*, на палабскай *zojąc*, на славацкай *zajac*, на чэшскай *zajíc*, на сербскай *зец*, на славенскай *zajec*, на балгарскай *заек*, на македонскай *заяк*, на стараславянскай *заѧць*.

Нехта звязвае гэтае найменне са словам 'ззяць' з-за расплюшчаных ('ззяючых') заечых вачэй, нехта са словам 'зелле' — і тады 'заяц' той, хто есць (грызе) зелле (капусту), але асноўная версія, рэканструіруючая гіпатэтычны індаеўрапейскі корань **g'hai*, што мусіў бы азначаць 'скакун', суадносіць яго з ім — найменне з коранем.

«Канчатковага этымалагічнага рашэння яшчэ няма», — гаворыцца пра 'зайца' ў «Этымалагічным слоўніку беларускай мовы».

Калі звернемся да самадзійскіх моў, убачым: у ненэцкай мове 'заяц' мае два суадпаведнікі. Першы *нява*: назоўнік, утвораны ад дзеяслова *нявота(сь)* — 'бегчы, несціся скокам, наўскок', другі *тэваси*, дзе *тэва* — 'хвост', а само *тэваси* азначае 'бясхвосты'. Аднак у лексіконе ненэцкай мовы ёсць яшчэ адно слова, якое азначае 'хвост', — *сане"(с)*, *сани"(с)*, з яго ўдзелам 'бясхвосты' *санеси*, *саниси*: з ім, з гэтым словам, збліжаецца старапрускае *sasins*, што азначае тое самае — 'заяц'.

Адна з асаблівасцей ненэцкай мовы, што ў ёй некаторыя гукі на пачатку слова не вымаўляюцца, у тым ліку звонкае фрыкатыўнае 'з', яно аднаходзіцца, калі суадпаведнае слова пераходзіць у іншую, прынамсі, славянскую, моўную сістэму. Так, *санеси*, фанетычна трансфармуючыся і ў выніку элізіі губляючы санорны 'н', становіцца *заеси*, а тады *заес* і *заец*. Аднак яго семантычнае значэнне застаецца першапачатковым: 'бясхвосты'.

Пціч

У найменні ракі Пціч (*Птыч*, даўнейшыя напісанні *Пътичь*, *Бъчичь*) прысутнічае тая самая марфема, што і ў найменні Іпуці, адно без 'воднага' кампанента і з асновай, адкарэгаванай сінкопаю, — *пт*. Што тычыцца марфемы *-іч*, то гэта пазнейшы суфікс, дапасаваны да асновы ў выніку акамадацыі, дзякуючы якой 'Пціч' набыла дадатковае фонасемантычнае адценне і пачала 'цячы'.

Ніякіх 'птушак' — ні славянскіх, ні балцкіх — у найменні Пцічы няма, ёсць адно 'пуць', а занатаваная некалі форма *Бъчичь* — яго суадпаведнік, што зазнаў пэўную фанетычную трансфармацыю: губна-губное глухое *п* саступіла месца губна-губному звонкаму *б*, а пярэднеязычнае змычнае *т* пярэднеязычнай афрыкаце *ч*.

Фота Святланы Тарасінскай.

Найменні рэчак Пёт, Пятух, Петушыха, Пята, Пятка, Пятая, што фанетыка-марфалагічна збліжаныя з найменнем Пцічы, тым не менш, з ім не роднасныя. У іх іншая семантычная аснова, яна ўзыходзіць да слова '*паёта*', што на ненэцкай мове 'зарослая алешнікам', альбо са слова '*пята(сь)*', што на ненэцкай мове 'ставіць сеткі для падлёднага лову' (так, *пята яха* — рака, дзе ставяць сеткі для падлёднага лову). З чым зроднена Пціч сваім найменнем, дык гэта з Прыпяццю.

Варонеж

Асобна спынімся на найменні 'Варонеж' — яго маюць і рака, і горад. Горад знаходзіцца на берагах ракі, яна за 12 км ад яго ўпадае ў Дон, а сам Дон у час вясновага разводдзя дасягае горада.

Даследчыкі выказваюць меркаванне, што старажытны Варонеж мог і не знаходзіцца на тым самым месцы, дзе знаходзіцца цяпер, а на месцы нейкага гарадзішча па берагах ракі Варонежа. Апрача варонежскага Варонежа, ёсць яшчэ Варонеж, што месціцца на рацэ Асота ў Сумской вобласці, а паводле гістарычных крыніц, існавалі яшчэ паселішчы, што мелі такое ж найменне.

Што азначае само найменне 'Варонеж', то асноўныя гіпотэзы наступныя. Філолаг-славіст І. Сразнеўскі лічыў, што этымалагічна яно зроднена са словам 'варона' ('ворон'), М. Фасмер — што яно паходзіць ад прыметніка 'вараны' ('вороной', чорны). Існуе гіпотэза, якая звязвае яго з мардоўскім словам 'вир' ('лес'), і гіпотэза, якая выводзіць яго паходжанне ад старажытнарускага імені Варанег ('Воронег').

І ўсё ж, аддаючы даніну павагі аўтарам названых гіпотэз, вяртаемся ў даўніну і да той семантыкі лексемы *неж*, якой вытлумачылася найменне вёскі Тонеж. *Неж* — гэта *неӈг*: ім маркіруецца месца ўнутры загарадкі, круга, абхопу, унутры рачнога сугібу, і ні ў беларускай, ні ў рускай мове яму няма яўнага адпаведніка. Аднаходзячы першапачатковую словаформу наймення 'Варонеж', атрымліваем *Варо' неӈг* (першы кампанент у родным склоне множнага ліку, другі ў назоўным склоне адзіночнага ліку: у ім заднеязычны змычны гук *нг* пяройдзе ў пярэднеязычны фрыкатыўны *ж*), у прыблізным і апісальным перакладзе гэта 'займетае месца ў сугібе берагоў'. Ад 'займетага месца' найменне перайшло і на саму раку.

Верабей

На беларускай мове *верабей*, на рускай *воробей*, на ўкраінскай *воробець*, *горобець*, на польскай *wróbel*, на верхнялужыцкай *wrobl*, на чэшскай *vrabec*, на славацкай *vrabec*, на сербскай *врабац*, на балгарскай *врабец*, на славенскай *vrabec*, на старарускай *воробии*, *воробеи*. Ды яшчэ на літоўскай *žvirblis*, на латышскай *zvirbulis*, на румынскай *vrabie*, на фінскай *varpunen*, на эстонскай *varblane*, на венгерскай *veréb*.

«Птушка названа так па гуках цвіркання», — зазначае этымолаг Г. Крылоў. «Птушка названа па сваім цвірканні», — этымолаг М. Шанскі. «З праслав. **ворбьйь*, вытворнага з суф. *-ьйь* ад асновы **ворб-*, што суадносіцца з гукапераймальным дзеясл. *Ворковать*», — этымолаг А. Шапашнікаў. «Магчыма, гукапераймальнае, але заўдзельнае ў кантамінацыі», — мяркуе этымолаг П. Чарных. Гэтыя версіі здагадкі, што зыходзяць з самога вераб'інага цвіркання, а не ад слова, якім ён атэстуецца: здагадкі слушныя, а слова застаецца нявытлумачаным і непрачытаным.

У слова *верабей* самадзійскае паходжанне, яно вытлумачваецца ненэцкім дзеясловам *вэре(сь)*, што азначае 'цвіркаць', 'свіргатаць', 'ціліўкаць'. У трэцяй асобе адзіночнага ліку з дадаткам суфікса доўгага дзеяння *-ба* дзеяслоў набывае форму *вэреба*. Напрыканцоваe *-ей* (*-ий*, *-ец*, *-ац*, *-ел*) субстантыўны фармант, які азначае пэўную істоту ці асабовасць. Верабей — хто (што) цвіркае.

Нядзеля

У самадзійскім сусвеце ў жанчыны асаблівы статус: яна своеасаблівая адтуліна ніжняга свету, і адтуль, з ніжняга свету, праз яе падступае магчымасць небяспекі. Так, паводле звестак этнографаў, ёй не дазваляецца ўдзельнічаць у абрадах ахвяравання, наведваць свяшчэнныя месцы, пераступаць цераз вупраж аленяў і розныя прылады промыслу, цераз дзяцей і мужчын, пераходзіць дарогу аргішу — гэта можа прычыніць шкоду людзям, аленям, дабрабыту. Мужчына, што быў неахайны, набываў атэстацыю, у якой прысутнічала іпастась жанчыны: няяўная 'нюхуй' і яўная 'нерха', што літаральна азначае 'падобны да жанчыны' (дзе *-рха* ўпадабляльны суфікс *раха* ненэцкай граматыкі) і ў рускай транскрыпцыі мае форму 'неряха'.

'Ахайнай' жанчына была тады, калі яшчэ не сталася жанчынай, і вярнуцца ў 'ахайны' стан зможа адно з цягам гадоў.

На ненэцкай мове жанчына *не*, на нганасанскай *ны*, на энецкай *нэ*, і ў сферы прасторы ў яе ёсць дзялянкі, замацаваныя менавіта за ёй, а таксама і ў сферы часу. Так, нядзеля — яе дзень.

На стараславянскай мове *недѣля* ('не работный день'), на рускай *неделя* (у тым самым значэнні, і 'понедельник', наступны за ёю дзень, кажа пра гэта), на беларускай *нядзеля*, на ўкраінскай *неділя*, на польскай *niedziela*, на верхнялужыцкай *niedźela*, на ніжнялужыцкай *nieźela*, на славацкай *nedeľa*, на чэшскай *neděle*, на балгарскай *неделя*, на македонскай *недела*, на славенскай *nedelja*, на сербскай *недеља*, на харвацкай *nedjelja* — мовазнаўцы аднадушныя ў меркаванні, што гэтае слова вытворнае ад словазлучэння *ne dělati* і азначае 'день неделания'.

Так ды не гэтак, гэтак ды не так. Гэтае слова субстрат: яно ўтворана не ў славянскай, а ў самадзійскай моўнай сістэме. У яго свой склад і лад, у ім другім кампанентам выяўляецца 'дзень', але ў самадзійскай транскрыпцыі: на ненэцкай мове 'дзень' *яля*, на нганасанскай *дялы*. Што да першага кампанента, то ён 'жаночы' — *не'*, і нядзеля — *не' (д)яля*: жаночы дзень. І калі для некага гэты дзень быў святочным і свяшчэнным (на ненэцкай *хэбидя*), то для некага наадварот — грэшным і грахоўным (*хэбёда*). У самадзійскім слоўніку М. А. Кастрэна *haebida* — 'sündig' ('грахоўны'), нядзеля (Sonntag) — *haebida jale'* ('грахоўны дзень').

Апроч таго, што *яля* 'дзень', гэта яшчэ і 'святло', 'сонца': так, літоўскае слова *saulė* (сонца) з ім зроднена. У ім сумясціліся і дапасаваліся адна да адной дзве лексемы: *сэв*, што на ненэцкай мове 'вока', і *яля*. *Saulė* — *сэв' яля*: святло-вока, вока-святло.

Ноч для адпачынку, дзень для справы, і ўсякае 'дело' тварылася тады, калі наставаў дзень (*яля*, *дялы*).

Нягледзячы на абмежавальныя статусы ў быце і ў побыце, жанчына ў самадзійцаў шанавалася. Так, слова 'неня', ці ў памяншальна-ласкальнай форме 'ненька', прыйшло ад іх і замацавалася ў словазлучэнні 'ненька Украіна'. На ненэцкай яно гучыць як *не"не*: у ім 'жанчына' прысутнічае ў ступені таўталогіі, і азначае яно 'лепшая з жанчын' ці літаральна 'жанчына з жанчын'. Ды і само слова *ненэй* ('праўдзівы, сапраўдны') суадгукаецца з ёю.

Алесь РАЗАНАЎ

---

* **Працяг. Пачатак у №№ 24, 27, 30, 32, 36, 37, 40, 43 (2021 г.); №№3, 6, 10, 18, 28 (2022 г.).**

Фёдар ГУРЫНОВІЧ

Рака дзяцінства

У плыткай рэчцы плёскалася лета.
Вада была празрыстай, як сляза.
Выслізгваў промень, ранкам абагрэты,
З аеравага вузкага ляза.

Плёс высланы быў сінімі шаўкамі.
Гарлачыкі пабліскваліе расой.
Лянотна шавяліліе плаўнікамі
Сярэбраныя зліткі карасёў.

Рабін надрэчных глянцавыя гронкі
Ужо нясмела сталі ружавець.
Быў я ўлюбёны ў гэты жнівень звонкі
І ў рэчку, абмялелую на трэць.

Яна ўздыхала неяк па-дзіцячы,
Хавала сарамлівы свой пагляд,
Як быццам знала, што інакшай бачыў
Яе я шэсцьдзясят гадоў назад.

Не перанесці!

За сотні вёрст ад матчынага дома
Я знаю ўсе і дрэвы, і кусты.
І кожнай птушкі голас мне знаёмы...
А дом без мамы сумны і пусты.

І ў люстры,
што ў абводцы залацістай
З шырокай шафы ўглядвалася ў нас,
Мне бачыцца вясна майго дзяцінства,
Хоць надышоў зіму прымерваць час.

Тут столькі светлых дзён
было пражыта!
Вачамі мамы кожны з іх світаў.
Чамусьці Маці Божая сярдзіта
Пазірквае з чырвонага кута.

І хочацца мне на сябе самога
Тут, сярод здымкаў блізкіх і радні,
Зірнуць вачамі праведнага Бога
І ад бяды дзяцей абараніць.

Прысесці ля стала на табурэтку.
Пачуўшы ў сэрцы неўтаймоўны гром,
За тое бічаваць сябе,
што рэдка
Наведваў я свяшчэнны гэты дом.

І калі смутак зноў мяне зацісне,
То, каб не ўбачыў малалетні ўнук,
Заплакаць раптам шчыра,
бы ў дзяцінстве,
Не перанёсшы гэтых горкіх мук.

Прачнуцца на світанні

Прачнуцца раптам на світанні
Ад радасці,
што побач ты,
І цалаваць цябе дыханнем
Пад першым промнем залатым.

Любіць, шчаслівым быць без меры,
Дабру і шчырасці спрыяць,
І калі ў што святое й верыць —
Дык у цябе, любоў мая.

І ў весні час, і ў лістабойны
Спяшаць і зблізку, і здаля
К адной табе, і жыць табою,
Як сонейкам жыве зямля.

Зінаіда ДУДЗЮК

Сад Янкі Купалы

У садзе Янкі Купалы
Жывуць патаемныя словы,
Да тых, хто пачуць іх здатны,
Выходзяць казкі са сховаў.

У садзе Янкі Купалы
Між яблынь таіцца натхненне,
Хто яго напаткае,
Здзейсніць усе памкненні.

У садзе Янкі Купалы
Гучаць дзівосныя песні.
Лепшую долю нам зычаць
Ці восенню, ці напрадвесні.

Сад Янкі Купалы вялікі,
Шмат нарадзіў паэтаў.
Іх вершы ўзнікаюць у сэрцах
І ўзыходзяць над светам.

* * *

Засохлы ліст трымціць на голым голлі,
Баіцца адарвацца і зляцець.
Яго браты ўсе адышлі паволі,
А ён не згодны на такую смерць.

Кругом зіма снягамі слепіць вочы,
І дзень за днём бязлітасна бяжыць.
А ліст упарта вырашыў аднойчы:
«Усе памруць, я застануся жыць!»

Пад ім ужо пупышка выспявае,
Гатовая сабою даць працяг.
Нябожчык — ён, але не ўсведамляе,
Што толькі цень мінулага жыцця.

* * *

Пялёсткі абрывае вецер,
Варожыць, мабыць, на каханне,
Хоць ведае: няма вяртання
Былому ў новае дасвецце.

Але ёсць радасць ад сустрэчы,
І свята светлае ўспамінаў,
Ды што было калісьці мілым,
Цяпер здаецца недарэчным.

І нават боль і горыч стратаў,
Што нас вучылі мудра думаць,
Былым не поўняць сэрца сумам,
Стаіліся пад ціхім спратам.

Пялёсткі абрывае вецер,
Варожыць, мабыць, на каханне,
Хоць ведае: няма вяртання,
Былому ў новае дасвецце.

* * *

Ты — госць з мінулага, прызнай,
Ты — песня даўняя, старая.
А час ад нас ляціць няўзнак
І новых казак не стварае.

Што ж, нам не варта сумаваць
Па тым, што спраўдзіць не паспелі,
Пакуль жыццё гайдае нас
На неўраўнаважаных арэлях.

Пашчасціць — старасць не міне.
І знешне мы даўно не тыя.
А ты яшчэ ўсё снішся мне,
І згадкі нашы маладыя...

Пятро ЛІПАЙ

Вершы Пятра Ліпая (1941—2010) друкаваліся ў рэспубліканскіх газетах і часопісах. На яго словы напісаны песні. Нягледзячы на тое, што ён з'явіўся на свет у адну з самых змрочных часін — першы дзень Вялікай Айчыннай вайны, у паэзіі і жыцці ён супрацьпастаўляе журбе святло і гумар, аптымізм і надзею. Да ўвагі чытачоў — патрыятычная лірыка паэта.

Сэрца Беларусі

Дзе Свіслач срабрыцца між долаў,
А шлях — на Маскву ды Парыж,
У цэнтры Еўропы, наш горад —
Зямлі беларускае волат
Нязломны, спрадвек ты стаіш.

Узнёсся ў праспекце Скарыны
Твой воблік славянскай красы —
Прыветны, руплівы, гасцінны,
Пад сцягам свабоднай краіны
На ўсе блаславёны часы.

Абеліск у высь глядзіцца,
Звон Сабора над гарой:
«Слаўся, Мінск — краса-сталіца!
Слаўся, Мінск — горад-герой!»

У памяці дзень вызвалення —
І радасць, і плач між руін...
Як доўга чакаў ты збавення!
Змагаўся, не стаў на калені,
Народа няскорнага сын.

Прад Вечным агнём пакланюся...
Мінск! Мужны твой подзвіг не згас,
З табой мы ў шчасці і скрусе.
Ты — сэрца святой Беларусі,
Ты ў сэрцы ў кожнага з нас!

Вяртанне на Бацькаўшчыну

Як на Уздзеншчыне любімай
Зноў зацвітуць сады —
Са смуткам светлым перад вачыма
Я зноў пайду туды.

Пайду ў край, дзе я пакінуў
Агонь святы душы,
Каб песні любае дзяўчыны
Даслухаць у цішы…

Каб мілаю сагрэцца ўсмешкай
Да слодычы ў грудзях,
Каб зноў прайсці юнацтва сцежкай
Па бацькавых слядах.

А боль і радасць ад сустрэчы
З Уздзеншчынай маёй,
І квецень мар, і майскі вечар —
Навек вазьму з сабой…

Мой дзень

Аўтабіяграфічная балада

Светлай памяці мілай матулі
Надзеі Іванаўны

Я нарадзіўся ў першы дзень вайны —
У чорны дзень, людзьмі навек праклятый,
У дзень, калі з крыжамі груганы
З выццём ішлі ў піке над нашай хатай.

І побліз, над Маскоўскаю шашой,
Па бежанцах страчылі з кулямётаў,
Па дзетках іх — з нявіннаю душой!
Фашысты ж асы шчэрыліся потым…

А паміж бежанцаў — скрозь плач, агмень,
Пад кулямі, ад смерці за паўрыскі —
Знямоглая матуля цэлы дзень
Мяне раджаць у вёску несла з Мінска.

Дзе ты, далёкая Варшава…

На плошчы Перамогі — свята,
А слёзы на вачах людзей...
Журбою, болем сэрца сцята
І у мяне у гэты дзень.

Дзе ты, далёкая Варшава,
І дзе палёг ты, бацька мой?!
Палае ў промнях Зорка Славы —
Заходзіць сонца за ракой.

Сівеюць у самога скроні,
Павырасталі ўжо сыны,
А помню я твае далоні,
І ты ў мае прыходзіш сны…

Адно жаданне сэрца поўніць:
Куды б дарогі ні вялі —
Знайсці, аддаць паклон сыноўні
І жменьку роднае зямлі...

* * *

Люблю цябе, мая матуля-Беларусь!
Затканы пушчамі льняных палёў абрус,
Вачэй-азёраў, рэк, лугоў тваіх красу,
Як скарб, з маленства у душы нясу.

Скарына мудры нам пакінуў запавет:
Старонкі роднае — адкуль пайшлі на свет,
Дзе мы ускормлены, — не можа быць мілей,
Як рыбам вір, а пчолам іх вулей...

Вякамі прадзеды — ліцвіны, крывічы —
Трымалі цвёрда і аралы, і мячы.
Бацькі цябе абаранялі як маглі,
Каб мы былі гаспадары зямлі.

Красой дзівоснаю квітнееш ты,
З табою крочаць поплеч сёстры і браты —
Славянскай крэўнасцю навек зрадніла Русь
Расію, Беларусь.

О, Беларусь! Адданыя твае сыны
Руплівай працай здабываюць шчасця дні.
Сястрою шчырай ты сябрам
заўжды была —
Хай Божа зберажэ ад бед і зла!

Фота Кастуся Дробава.

Сяргей ТРАХІМЁНАК

«Суры ці Белы бык залатыя рогі»

Урывак з рамана

У 2013 годзе ў Маскве у выдавецтве «Белыя альвы» пабачыла свет кніга Уладзіміра Дзегцярова і Сяргея Трахіменка «Беел ла Русь» — пра старажытныя тапонімы і гідронімы Беларусі. У мінулым годзе ў Мінску выйшаў раман С. Трахімёнка «Нобелиат», у якім працягваецца даследаванне ведычных часоў чалавецтва. У рамане «Суры ці Белы бык залатыя рогі» У. Дзегцяроў і С. Трахімёнак зноў узяліся за распрацоўку тэмы дахрысціянскага перыяду чалавечай гісторыі. Аўтары, абапіраючыся на гіпотэзу катастрафічнага змянення клімату ў Цэнтральнай Афрыцы, даследуюць прычыны вялікага перасялення народаў у восьмым тысячагоддзі да н. э. Заснаванае на старажытных містэрыях апісанне перамяшчэння сураў з Афрыкі ў Азію дае адказы на многія пытанні мінулага, якія і ў наш час не страцілі сваёй актуальнасці. «ЛіМ» друкуе ўрывак з рамана «Суры ці Белы бык залатыя рогі».

Пячатка крыві

Начальнік ваеннага сходу, Вайсковы ўладнік, спешна ўвайшоў у шацёр Уладара.

— Горад зачыніўся, — паведаміў Ас Сур Бані Баалу Вайсковы ўладнік, — загадай даць каманду на разварот машын каменнага бою.

— Ідзі ты адсюль! Усё б ваяваць дурылу! Як дзіця, ёй-ёй! — раззлаваўся камандзір асабістай аховы Уладара. — Пачакай! Вайна ўжо ўпоперак горла стаіць!

Ас Сур Бані Баал Борг маўчаў. Ён з цікавасцю сачыў, як новы пісар намагаўся працаваць навыварат, ад левага краю. Пісар гучна соп і пісаў леваруч. Але толькі дарэмна драпаў вошчаную дошчачку. Пісьмо ў нязвыклым правым напрамку не ішло. Не ішло!

— Адчапіся! — сказаў пісару Ас Сур Бані Баал, — пакінь нас.

Пісар з радасцю адышоў ад стала, пакінуўшы на ім дошчачкі і пісьмовыя стыло. Праслізнуў углыб шатра, да картографаў, і там затаіўся. Захістаўся высачэзны кедравы слуп, цэнтравое апірышча шатра Уладара. Дужэзныя сабакі Борга забурчалі, заторгалі павадкі, прывязаныя па звычаі да слупа, затрэслі слуп. Пісар, які слізгануў міма сабак, меў пах не сурскі, а эфіопскі.

— Пачакаем паслоў, — адазваўся нарэшце Борг, паварочваючы жорсткі рыжабароды твар да Уладніка. — Маё воінства і сапраўды стамілася. Пачакаем паслоў…

Начальнік ваеннага сходу імгненна адвярнуўся ад Уладара, паціснуў плячыма і таксама пайшоў у кут картографаў. Там малады рысавальшчык жвава сшываў скуранымі папружкамі пласты антылопіных скур, складаў карту Вялікага паходу. Размаляваныя скуры яму выдаваў стары з белай барадой, Галоўны Знаўца і захавальнік карты. Стары Картограф, па вядомым толькі яму парадку, даставаў пласты маляванай скуры са свяшчэннага мяшка, пафарбаванага ў чырвоны колер.

На скураным полі ўжо выразна праяўляўся знаёмы абрыс уладанняў краіны Кім, сінія лініі святых рэк Яўфрат і Тыгір. Рысавальшчык прышпіліў шнурком яшчэ дзве маляваныя скуры, і Вайсковы ўладальнік раптам ухапіў зрокам кавалак сіняга колеру — мора Дын Гір Кана.

Ад убачанага аж заняло дыханне, а пасля вырваўся спалоханы гарлавы сіп. Малады рысавальшчык імгненна павярнуўся да Вайсковага ўладніка, рука са скураным шнурком задрыжала.

— Шый далей! — буркнуў рысавальшчыку Стары Картограф. — Цяпер можна паказаць тайную Карту старажытнага шляху па зямлі. — Шый далей!

Рысавальшчык хутка ўсунуў папругі ў дзве маляваныя скуры, і да палатна Карты прышыліся малюнкі, якіх начальнік войска яшчэ не бачыў. На карце з'явілася яшчэ адна велізарная сіняя пляма, правей і крыху вышэй мора Дын Гір Кана. Адчуўшы дрыжыкі ў каленях, ён прачытаў пісьмёны на сіняй пляме:«Баал Хаш». Бога Баала Меч.

— Туды пакуль ідзём, — сказаў за яго спінай Уладар Борг. — Ідзём да возера Баал Хаш. Сто дзён нам туды яшчэ ісці. Таму і ваяваць няма чаго. На пачатку вялікай дарогі навошта гараваць… Так?

Present simple

Але пагутарыць з дзіўным пацыентам Васілю Пятровічу ўдалося толькі на наступны дзень, перад гэтым яшчэ раз прагледзеўшы гісторыю хваробы. Дзіўны пацыент быў дастаўлены ў бальніцу нарадам міліцыі. Нарад звярнуў увагу на чалавека незразумелага ўзросту ў чыгуначным скверы. Апрануты ў нейкае рыззё, ён сядзеў на лаўцы і ваўкавата азіраўся. На пытанні хто ён і адкуль міліцыянеры адказу не атрымалі, таму даставілі дзівака ў аддзяленне. Але начальнік, толькі зірнуўшы на затрыманага, патэлефанаваў псіхіятрам. Тыя адказалі, што, мяркуючы па прыкметах, гэта іх пацыент. І таго перавялі ў клініку.

Перад Васілём Пятровічам сядзеў даволі малады мужчына ва ўзросце не больш ад дваццаці пяці гадоў, астрыжаны дагала. Аднак крыху адрослыя валасы сведчылі аб тым, што яны мелі русы колер.

Пацыент глядзеў на Васіля Пятровіча сінімі вачыма з дзіўным нейтральным выразам твару, у якім не было ні страху, ні цікаўнасці, нічога.

— Я новы галоўны ўрач бальніцы, — прамовіў Васіль Пятровіч, — вы разумееце, аб чым я кажу?

— Так, — прамовіў пацыент і паўтарыў сказанае, — я разумею, аб чым ты кажаш.

— Вы памятаеце, як вас завуць?

— Так, — сказаў пацыент, — я памятаю, як мяне завуць.

— А вы маглі б адказваць крыху шырэй і не люстраваць мяне?

— Так, — адказаў пацыент, — я магу адказваць больш шырэй і не люстраваць цябе.

— Вас, — паправіў Васіль Пятровіч.

— Вас, — згадзіўся пацыент.

— Такім чынам, як вас завуць?

— Мяне завуць Кібат.

— Гэта ваша прозвішча?

— Прозвішча — гэта назва роду?

— Няхай будзе так.

— Не, гэта маё імя.

— А прозвішча свайго вы не ведаеце?

— Прозвішча свайго я не ведаю. Я быў узяты ў навучанне ў маленстве.

— І дзе ж вы вучыліся?

— Спачатку я выхоўваўся дзядзькамі і навучаўся мастацтву ваяра і лекара, пасля — пісьму і мовам у Шумеры.

— Гэта дзяржава на Блізкім Усходзе?

— Хутчэй некалькі гарадоў, дзе навучаюцца пісары Вялікай імперыі сураў.

— І што гэта за імперыя, — з іроніяй задаў пытанне галоўны ўрач, — дзе яна знаходзіцца?

— Калісьці яна распасціралася, — без ценю збянтэжанасці адказаў пацыент, — ад Індыі да Егіпта, калі карыстацца вашымі назвамі.

— Чаму распасціралася?

— Таму што ўсё, што з'яўляецца, рана ці позна знікае, усё, што нараджаецца, памірае.

— Дазвольце пацікавіцца, — зноў жа з іроніяй вымавіў Васіль Пятровіч, ужо задаволены тым, што разгаварыў пацыента, — а што ж здарылася з Вялікай імперыяй сураў?

Пацыент маўчаў.

Пераклад Ільі БОХАНА.

Яна ЦЭГЛА

Няміга і Менск

Стаіць гэты горад і цяпер. З белай вежай вышэй за будынкі. З залатымі цэрквамі і срэбнымі касцёламі. З чорнымі манастырамі і рознакаляровымі церамамі. Там дамы будавалі з вечных дрэў. Там дарогі клалі з вялікага каменю. Там людзі без страху і граху жывуць.

Схавалася глыбока ў плыні ракі Няміга. Збераглі воды прыгожасць яе. Вочы блакітныя, як вада ў ручаях вакол. Валасы густыя і доўгія, як лясы вакол. Гарадскім Валам уздымаюцца пад адзеннем дзявочыя грудзі. Сцежкі людзей — як маршчынкі ад маладой усмешкі. А маленькія дамы каля сцен нібы пушок над вуснамі.

Была паннай яна ў гэтых месцах. Будавалі пад яе наглядам чароўны горад. Далёка ад усіх ворагаў і захопнікаў. Там, дзе ўсе рэкі ў адну ядналіся. У тым месцы, дзе сярэдзіна зямлі. Толькі той, хто меў човен, мог трапіць на схаваную Нямігу.

Потам і цяжкай працай упрыгожана зямля ў гэтым горадзе. Кожны чалавек сам сабе будаваў жытло. Сам сек векавыя дубы і сосны. Сам клаў кожнае бервяно. Уласнаруч ладзіў плот. Клікаў гасцей на наваселле, а ў цэнтры стала сядзела яна — Няміга.

Шкадавалі і любілі гаспадыню сваю гараджане. Хваляваліся, што без пары. Увесь час пыталіся ў яе вялікай галавы, што сачыла за імі на кожнай сцежцы-дарожцы, калі адружыцца яна з некім. Ды парадуе ўсіх іх. Абяцалі ёй вяселле зладзіць, каб зямля трэслася і вада з азёр вылівалася.

Сам прыйшоў да яе жаніх. Быў высокі і тоўсты. З-за вялікай доўгай чорнай барады сам дарогі не бачыў. Доўгія свае валасы хаваў пад капелюшом. А калі нешта прамаўляў, то вусны яго рабіліся ў два разы большыя.

Звалі паўсюль яго Менскам. Быў ён вядомым волатам і жорсткім уладальнікам. Выгналі яго са старога месца, і прыйшоў ён сюды. Ад добрых людзей пачуў, што Нямігі гаспадыня не замужам. Прыйшоў ён да прыгажуні сватацца.

Пагадзілася пад ціскам дарадчыкаў яна на вяселле. Гулялі яго ўсёй зямлёй. Як жыхары Нямізе і абяцалі. Як ніколі прыгожай была яна. У сукенцы з малака і ў туфлях з мёду. Добра елі і выпівалі ўсе.

Ды калі Менск напіўся моцна, то пайшоў з Нямігай у адзін пакой. У начным святле нешчаслівай зоркі, якая ззяла праз вузкае акно пакоя, задушыў ён уладальніцу гэтай зямлі. Нацягнуў на тонкую шыю людскіх сцежак бурштынавыя пацеркі са святла ад фар машын.

Бледны і хворы на твар, выйшаў ён з пакоя і абвясціў свой час. Зруйнаваў усе дамы з вечных дрэваў. Выбудавалі страшныя пачвары на іх месцы жалезабетонныя хмарачосы. Румяныя дарожкі паміж дамамі, не шкадуючы, закатаў у асфальт.

Тлуснеў ён і тлуснеў: Малінаўка, Ангарская, Каменная Горка. Тратуарнай пліткай залегла шэрасць пад вачыма новага ўладальніка. Узвёў ён масты над ракой, каб людзі ніколі не адшукалі яго таямніцу. Схаваў у каменную труну ён сваю нявесту.

Ляжыць на глыбіні маладая дзяўчына. Менск хацеў, каб зусім пра яе забыліся. Ён тут гаспадар і ўладальнік. Ды памяць людзей захавала Нямігу-раку. І колькі б Менск ні панаваў, а прыйдзе час — абудзіцца ад векавога сна Няміга і паўстане ўсё, як было раней.

Верыць у сілу кахання

Сёння да ўвагі чытача — паэзія расійскіх аўтараў Веранікі Тушновай і Сяргея Главюка, пераствораная па-беларуску айчыннымі літаратарамі. Тонкая інтымная лірыка, настраёвыя замалёўкі, пейзажныя матывы — тое, што натхняе на высокія ноты духоўнасці, шчырасці, спагады.

Вераніка ТУШНОВА

* * *

Трымценне сэрцайка майго,
цяпло даверлівага цела…
Узяў як мала ты з таго,
што я аддаць табе хацела.

А ёсць тугі дурман салодкі
і горкі пах чаромхі звялай,
палёт птушынага кагалу
вакол знікаючых аблокаў.

Ёсць шэпт ракі распавядальны
і гоман галькі берагоў,
картавы,
непераклад альны
ні на адну з вядомых моў.

Павольнага заходу меднасць
і танец лісця на дварэ…
Які ж багаты ты, напэўна,
што анічога не бярэш.

* * *

Я стаю, адчынены дзверы.
Развітанне. Сыходжу ў цішы.
Ні ў што я ўжо больш не веру,
а ўсё роўна прашу — пішы!
Каб познім жалем змяты пад маскаю
твар не хаваць — цяпер
напішы мне ліст, калі ласка,
на тысячу год наперад.
А не наперад — дык за тое, што праміне,
і за спачын душы,
напішы прыгожае пра мяне.
Я памерла ўжо. Напішы!

* * *

Ты не гаруй пра мяне,
не стагні, —
табе, а не мне
дажываць у хлусні,
ці ж мне загадаюць:
— Маўчы!
Усміхайся! —
калі хоць крыкам крычы.
Да самага скону не трэба мне
думаць — так,
а казаць — не.
Я жыву ў ладзе з сабой,
як на далоні ўвесь мой боль,
як на далоні жыццё маё,
вось яна я —
якая ні ёсць!
Мне цяжка,
бываю і я ў журбе,
але ж не мяне пашкадуй —
сябе.

* * *

Ніколі такімі далёкімі не былі,
але ж мае крыўды — у выгнанне,
і што б мне насуперак не плялі —
веру ў сілу кахання.
О, не, не ў камення мёртвага сілу —
у сілу жывую ствала…
І вось сціраю парэшткі пылу
з паліц тваіх і стала.
Лаічу, гладжу жывой рукой
тугія карэньчыкі кніг,
і ў тысячны раз знайду супакой,
ад тугі сыходзячы ў іх.
Асобны рахунак расстайных нягод,
як у баі, на вайне:
дзень за месяц, месяц за год…
За гэта даруюць мне.

* * *

Вось і час развітання
ля апошняй мяжы…
Можа, з новым каханнем
ты наважышся жыць.
Можа, райскім спакоем
адорыць яна…
Папрашу пра адно я —
ты мяне ўспамінай.
Калі раптам пад крокамі
хрусне ранішні лёд,
калі там пад аблокамі
прагрыміць самалёт,
адштурхне абыякава
вецер хмары ўбок,
ды ад суму сабака
заскуголіць у змрок,
калі лісце кружыцца,
калі сціх лістапад
і ўначы аканіцы
загрукочуць не ў лад,
калі ранкам бялюткім
певень дзесь запяе —
ты згадай мае рукі,
слёзы, вершы мае…
Выціраць не старайся
нават з сэрца сляды.
Не спрабуй,
не змагайся —
я паўсюль, я заўжды!

* * *

Ад самоты аж сэрца плача,
але ўсмешка — мой шчыт ад ран.
Я кахаю
і гэта значыць —
я жадаю табе дабра.

Гэта значыць, мая ты ўцеха,
што не трэба казаць ці ехаць,
і не трэба смутку і жалю,
і не трэба жыць у трывозе,
і не трэба, каб у дарозе
дзесь світанкі мы сустракалі.

Вось і старасць ужо маячыць,
не пра тое мроіць пара…
Я кахаю
і гэта значыць —
я жадаю табе дабра.

Значыць —
як мне цябе пакінуць,
як жа памяць мне з сэрца выняць,
як не грэць тваіх рук азяблых
з ношай, што аніхто не ўзняў бы?

Хто ж падкажа, мая ты ўцеха,
трэба ехаць,
не трэба ехаць,
на якіх спыняцца шляхах?
Нам ніхто пра гэта не скажа,
і ніхто той шлях не пакажа,
і ніхто вузла не развяжа…
Хто сказаў, што лёгка кахаць?

Пераклад з рускай
Яўгена СКІБСКАГА

Сяргей ГЛАВЮК

* * *

Шлях жыцця марна цягнецца цугам,
Я гляджу на яго, бы ў кіно.
Вось спыніўся бядак-валацуга,
Заглядзеўся ў пустое акно.

Мо здалося яму, што за шторай —
Нейкі цень на далёкай мяжы.
Вось і я на экране прасторы
Нешта бачу ў жыццёвай імжы.

Да пары ўсё здавалася ясным —
Белы свет не хавала імгла.
Што ж убачыў бядак той няшчасны
За квадратам нямытага шкла?

На дарогі, пустыя бульвары
Палатно зорнай ночы лягло.
Недзе зніклі масты, тратуары,
І струменіць з нябёсаў святло.

У шкляныя аконныя вочы
Зазірне — зніючыць цемры дымы.
Раптам знікне цяжар адзіноты —
Не бяда, што пустуюць дамы.

* * *

Абдымеш ложак слабаю рукой,
Гартанню захрыпіш:
«Цябе кахаю!».
Напэўна, так мяцеліца вясной
Дарэмна каляндар назад гартае.
Знясілеўшы, ты будзеш ціха выць,
Заломваць рукі,
заклінаць нябёсы.
Я ж буду ў гэты час паціху плыць,
Парваўшы ланцугі няволі-лёсу.
Пясок не можа захаваць сляды,
Яны не застаюцца й на вадзе.
Шукаць мой родны погляд станеш ты
Сярод натоўпу —
між чужых людзей.
Ты будзеш рвацца і шукаць, шукаць,
Перасякаць мінулага мяжу.
Мяне ў сустрэчным кожным пазнаваць,
Да кроплі аддавацца міражу.
Назад я не вярнуся… Але ж ты,
Як цень, услед пацягнешся за мной.
Дыханнем станеш растапляць ільды —
Яны ж ізноў паўстануць над вадой.

А ты ў палонцы, нібы птушка тая,
Заб'ешся, закрычыш: «Цябе кахаю!»
Ды толькі адаб'ецца ад крыжоў
Слабое рэха — я нідзе ўжо…
Я растварыўся ў пыле, у паветры,
У зёлках, дрэвах, камяках зямлі.
Між намі — не гады, не кіламетры…
Я — вечнасць, зоркі, цішыня, спакой,
Я ёсць — мяне няма:
як рэха над ракой.

* * *

Сівымі дрыжыкамі цягне ад ракі,
І цеплынёй — ад вуснаў, ад рукі…
Прабегла дзесяць год —
змяніўся свет,
Але ж не знік у парку даўні след.
Крыху ён сцёрся, бо прайшло шмат год,
Але ўсё той жа,
хоць і ў складках, рот.
Аскепкі лёду, змерзлы вадаём,
Па склізкім лёсе мы з табой ідзём.
Галінак заінелых ціхі звон,
Прыроды аняменне — мёртвы сон.
Ідуць дзве паралелі — дзве лыжні, —
Снягамі не замецены яны.

* * *

Сцямнела і сціхла.
Рака засынае, —
Слязою застыў пераменлівы час,
А ў восеньскім небе ізноў праступае
Вачэй металічна-уранавы бляск:

Глядзяць, не міргаючы, пільна і моўчкі.
Удзень іх не бачу — у тлуме жыву.
А ноччу ў сінечу скіроўваю вочы —
Да неба закідваю зноў галаву.

Карундавым дыскам свяціла начное
Гмах цемры на тысячы блікаў драбніць.
Аднойчы мне гэткай жа ціхай парою
Паступіць пасланне — за рысу ступіць.

* * *

Імклівая і рэзкая, жывая —
Пяшчотная ты рана нажавая ...
Я ў інтэрнэце твой адкрыў партрэт —
Была ты ў ліпені,
але прастыў твой след.
Здаецца, не жыву цяпер — канаю:
Па краі прорвы быццам бы блукаю.
Адказ адзін, хоць здзейснена сем бед.
І толькі рот, як рыба, адкрываю —
Цябе няма — і цёмны гэты свет —
Паветра ротам прагна я глытаю…
А ты забылася адкрыць мне
свой сакрэт.

* * *

Навокал неба — шэрае, глухое,
Нас у палёце — двое, толькі двое.
Два турманы[1] адбіліся ад зграі,
Світае — пад крылом агні знікаюць.
Два турманы сустрэчы выпадковай —
Два штурманы узвышанага слова.
Зямная цвердзь, нябесныя патокі,
Мы — над, мы — пад,
і шлях у нас шырокі.
Дамы, праспекты —
круціцца планета,
Зямля сагрэта, песнямі апета,
На небе — месяц, яркіх зорак зерне.
Мы рызыкуем… Мо назад павернем?
Ты бачыш, як радзее атмасфера,
Энергіі віхураць Люцыфера,
Часціцы пралятаюць, нібы мушкі,
А мы з табой —
зямнога свету птушкі.
Слабеюць сілы, словы там знікаюць,
І ні анёлаў, ні абрысаў раю,
Зямное ўсё растала, быццам дым…
Глядзі, Гасподзь,
як мы над безданню ляцім!

---

[1] Турман — штучна выведзеная парода галубоў, здольных куляцца ў палёце.

Пераклад з рускай
Святланы БЫКАВАЙ

з пісьменніцкай лабараторыі

Якім мне ўяўляецца чытач маіх кніг?

Дзіцячыя пісьменнікі абавязкова павінны быць крыху чараўнікамі і пачынаць ладзіць дзівосы ад самага пачатку стварэння кнігі. Калі я пішу новую казку, то ператвараюся ў Кніжную фею і пад вокладку хаваю нешта чароўнае, цікавае, карыснае, вясёлае, прыгодніцкае, фантазійнае… Дадаю ў творы драбок чараўніцтва, бязмерны кубачак дабрыні, шчодрую жменю цікавостак, яркае дражэ весялосці, зярняткі духоўных каштоўнасцей і загадкавы, непрадказальны на смак кампанент — для вастрыні сюжэта. Усё самае лепшае для сваіх чытачоў! А якія яны?

Уяўленне малюе цудоўных хлопчыкаў і дзяўчынак, якія любяць чытаць. У іх пакоях месцяцца паліцы з кнігамі, штовечар яны бяруць адтуль нейкі асобнік і чытаюць перад сном. Радасна, калі ў іх хатніх бібліятэках ёсць і мае кнігі. Ідэальныя чытачы. Дакладна ведаю: такія існуюць! Мне выпала пісьменніцкае шчасце асабіста пазнаёміцца з такімі аматарамі чытання. Як расцвітае сэрца, калі хлопчыкі і дзяўчынкі расказваюць, што прачыталі мае кнігі, што яны ім вельмі спадабаліся і што чакаюць наступных гісторый пра герояў — ужо добрых сяброў.

Вельмі радуюся тым, хто прачытаў усе мае творы. Згадаю пра трох такіх аматараў: прыходзілі на мае творчыя сустрэчы два хлопчыкі, якія маюць у хатняй бібліятэцы ўсе мае кнігі. Першыя выданні, якіх даўно не знойдзеш у крамах, перайшлі ім у спадчыну ад старэйшых братоў-сясцёр. Трэцяя ў гэтай выдатнай кампаніі — дзяўчынка Даша — адзінае дзіця ў сям'і. Мама чытала ёй з пялюшак і мае казкі таксама! У іх асабістай бібліятэцы не было толькі самай першай маёй кнігі «Падарожжы ў Чароўны лес». І сталася так таму, што кніга выходзіла ў 2008 годзе, калі Даша яшчэ не нарадзілася. З вялікім задавальненнем я падарыла сваёй чытачцы экзэмпляр.

Але не толькі такімі ідэальнымі мне ўяўляюцца мае чытачы. Дакладна ведаю, што яны бываюць розныя. І часам некаторыя хлопчыкі і дзяўчынкі ніколі б не сталі маімі чытачамі, бо… проста не любяць чытаць. Каб перамяніць сітуацыю, Кніжная фея на крылах натхнення ляціць на сустрэчы з дзецьмі ў бібліятэкі, школы, дзіцячыя садкі… І стараецца ператварыць звычайных хлопчыкаў і дзяўчынак у чытачоў! Не раз чула ад дарослых скептыкаў: «Ты столькі намаганняў, энергіі, часу, фінансаў траціш на паездкі, выступленні. Замаўляеш майстрам фееўскія строі, казачныя атрыбуты, лялькі-персанажы. Хіба патрэбны сучасным дзецям кнігі? Думаеш, усіх зацікавіш чытаннем,

Фота Кастуся Дробава.

калі ў іх руках тэлефоны?..» Усіх, можа, і не зацікаўлю, але канкрэтных дзяцей (і іх нямала!) атрымалася! Я ведаю гэта праз зваротную сувязь не толькі з маімі юнымі чытачамі, але і іх бацькамі, якія пішуць мне ў сацсеткі. Грэюць пісьменніцкае сэрца паведамленні: «Вы сапраўдная Кніжная фея! Сын не цікавіўся кнігамі, а тую, што набыў пасля сустрэчы, чытае!», «Я не думала, што маё дзіця можа ўзяцца за чытанне без прымусу. Пасля знаёмства з вамі было столькі эмоцый, радасці і… з'явілася прага чытаць!», «Мая дачка з жаданнем чытала кнігі толькі на рускай мове. Урокі беларускай мовы і чытання не любіла. Вы здзейснілі нейкі цуд! Зачаравалі яе! Набылі ўжо некалькі вашых кніг, і яна чытае іх з вялікім задавальненнем. А калі ў другім паўгоддзі стала больш урокаў беларускай мовы — яна ўзрадавалася, бо палюбіла роднае слова. Вялікі дзякуй вам, Кніжная фея!», «На кніжнай выставе пасля праведзенай вамі цудоўнай прэзентацыі купілі вашы шахматныя казкі з аўтографам. Гэта першае, што прачытала наша дачушка на роднай мове. Хутка пойдзем набываць наступную — ваша юная чытачка хоча пазнаёміцца з лісачкай Красуняй!», «Дзякуй вам за цікавыя кнігі! Чытаю іх па вечарах сваім дзеткам. Слухаюць з задавальненнем, мы цудоўна праводзім час разам. А яшчэ ў нас добрай традыцыяй сталі пастаноўкі. Дзеці — рэжысёры і акцёры. Вашы персанажы на дамашняй сцэне штовечар. Спектакль пра Вухуціка — хіт сезона!»

Пачытаеш такія водгукі, і думаецца, што шмат зроблена, і такі вынік пісьменніцкай працы натхняе. Але ж гэтага недастаткова. Яшчэ шмат дзяцей, хто не адкрыў для сябе дзівосны свет чытання. Зрабіць сваім чытачом таго, хто не бярэ кнігу ў рукі, — задача няпростая. Такіх прэтэндэнтаў на далейшае сяброўства з кнігай я заваблівае рознымі цікавосткамі, якія дадаю пад вокладку. Каб пазнаёміцца з выданнем, замест чытання анатацыі можна паглядзець буктрэйлер, схаваны ў *QR*-кодзе, — мульцікі дакладна любяць усе! Вось дзіця яшчэ ніводнага радка не прачытала, а ўжо мае ўяўленне, пра што кніга. Хутчэй за ўсё возьме і пагартае яе. І абавязкова знойдзе сярод прыгожых яркіх малюнкаў яшчэ схаваныя сюрпрызы і напаткае гульню-вандрульню. А гуляць любяць усе дзеці. І вось прэтэндэнту на сяброўства кніга ўжо падабаецца, бо яна паказвае мульцік, запрашае ў квэст-падарожжа, тэлепартуе, дае спасылкі на спампоўку арыгінальных стыкераў, прапаноўвае раздрукаваць размалёўкі, паказвае творчыя майстар-класы, перакручваецца дагары нагамі… Ну і забаўка-хадзілка ёсць. Хутчэй за ўсё, гуляць з кнігай будуць! Але ж гульня-вандрульня і іншыя цікавосткі створаны па сюжэце кнігі, так што і тут я імкнуся надаць матывацыю да прачытання. Спадзяюся, нешта абавязкова спрацуе, і прэтэндэнт стане маім чытачом. Шчасце мець менавіта такіх!

Я пішу на роднай мове. І тут бываюць прыкрыя моманты з патэнцыйнымі чытачамі. Часам дзеці яшчэ на самым пачатку сустрэчы прызнаюцца, што не разумеюць беларускую мову. Тады я абяцаю напрыканцы растлумачыць ім усё, што яны не зразумеюць. Пазней высвятляецца, што пытанняў няма, бо цудоўна ўсвядомілі сэнс. Дзеці не адмаўляюцца ад кніг, напісаных па-беларуску, гэта, хоць і рэдка, але здараецца з бацькамі. Працую ў гэтым кірунку, здаецца, вынікі ёсць.

Дык ці атрымаецца зрабіць чытачамі ўсіх? Гэта праца бясконцая, пастаянная і вельмі патрэбная. А ў нас столькі цудоўных пісьменнікаў! Мы ладзім цуды разам, кожны ў сваім амплуа, са сваімі героямі і сюжэтамі. Кнігі, сустрэчы, імпрэзы… У дзіцячых сэрцах гэта абавязкова адгукнецца!

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ

Пімен ПАНЧАНКА:

«Без калектыву я не магу…»

У букіністычным аддзеле на вочы трапіла кніга Рыгора Бярозкіна «Паэзія праўды». Выдадзеная ў Дзяржаўным выдавецтве БССР у 1958 годзе, яна складаецца з грунтоўных творчых партрэтаў Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Максіма Танка. Упершыню адкрыў яе старонкі яшчэ ў 1970-я. Зараз прыцягнула тое, што кніга — з пазнакамі ўважлівага чытання. На яе старонках — шмат падкрэсліванняў. Відавочна, рознымі чарнілами.

Фота БелТА.

Пімен Панчанка, 1967 г.

…У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь з пазнакай «Группа писем ЦК КП Белоруссии 6 марта 2336» захоўваецца ліст Пімена Панчанкі да Пятра Міронавіча Машэрава. Зусім кароткі. Вось з якім клопатам звяртаецца на той час аўтар многіх кніг, аўтарытэтны пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Купалы да першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі… «Дарагі Пётр Міронавіч! Без працы, без калектыву жыць я не магу. Дайце мне мажлівасць папрацаваць у "Полымі". Самае горкае адчуванне, калі ты не патрэбны роднай партыі.

Я хварэў. Цяпер здольны працаваць.

З глыбокай павагай —

Пімен Панчанка.

28. II. 72 г.»

З сакавіка Пётр Міронавіч прачытаў ліст і накладвае рэзалюцыю: «Кузьмину А.Т. Каково Ваше мнение?..» Аляксандр Трыфанавіч сакратаром ЦК па ідэалогіі быў абраны ў лютым 1971 года. Да гэтага часу працаваў некаторы час загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ. І, канешне ж, каму, як не Аляксандру Трыфанавічу вырашаць пытанне, чым далей займацца вядомаму паэту... Да нядаўняга часу Пімен Емяльянавіч працаваў сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У гэты перыяд выйшлі яго кнігі «Пры святле маланак» (1966), «Размова з наследнікамі» (1967), у гэты перыяд, відавочна, пісаліся вершы, якія пасля складуць зборнікі «Снежань» (1972), «Вершы» (1973)…

Чаму зборнік названы «Снежань»?.. «Слаўлю службу верную, // Слаўлю дружбу вечную! // Нарадзіў Кастрычнік нас, снежань парадніў». …І вось як гэта выглядае па кароткім звароце Панчанкі аж першаму сакратару, да паэта праяўляецца нейкі недавер… І ўсё ж ліст разглядаецца.

Тым больш, што 9 сакавіка А. Кузьмін піша запіску тав. Марцэлеву. Загадчыкам аддзела культуры ЦК на той час працаваў Станіслаў Марцэлеў (1926—2003), у будучыні — дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1976—2003), доктар гістарычных навук, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР. Запіска даволі лаканічная і для падначаленых, пэўна ж, зразумелая: «Тов. Марцелеву С. В. Заключение отдела. Я — против…» Значыць, тэрмінова рыхтаваць «заключэнне аддзела» ў адпаведнасці з меркаваннем…

15 сакавіка 1972 года Алесь Савіцкі, у той час — загадчык сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК, піша сваё заключэнне: «Пятилетняя практика работы т. Панченко секретарем Союза писателей БССР говорит о нецелесообразности направления его на работу в редакцию журнала "Полымя". Заўсёды гатовы!

Учитывая договоренность т. Панченко с руководством Союза писателей, считали бы возможным поддержать просьбу М. Танка о работе т. Панченко в должности главного редактора издательства "Художественная литература"».

16 сакавіка на гэтым дакуменце з'яўляецца рэзалюцыя А. Кузьміна: «Марцелеву С. В. Вносите проект согласно договоренности (К. Киреенко)». Вось і сыходзіцца ўсё… У аддзеле ўжо, відавочна, атрымаўшы падтрымку зверху, усё вырашылі за Пімена Емяльянавіча. Лёс Паўла Кавалёва, які яшчэ рэдагаваў «Полымя», быў вырашаны. Яшчэ 15 сакавіка адзін з работнікаў ЦК дакладвае наверх: «Принято постановление бюро ЦК КП Белоруссии об освобождении Ковалёва П.Н. от обязанностей главного редактора журнала "Полымя" и назначении ему персональной пенсии…» І на яго, Паўла Кавалёва, месца галоўнага рэдактара «ўводзілі» Кастуся Кірэенку, які быў галоўным рэдактарам «Бярозкі»… Што да выдавецтва, то Панчанка не туды разлічваў патрапіць. Але і ў «Художественную…», трэба разумець — у «Мастацкую літаратуру» (выдавецтва яшчэ толькі нараджалася), Пімен Емяльянавіч не пайшоў. Астатнія гады аддаў выключна творчай працы.

Як па тым часе, то зусім не горшы варыянт… Паэт заставаўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Шмат пісаў, шмат друкаваўся. Адна за другой выходзілі яго кнігі. У 1981 годзе за кнігу «Дзе начуе жаваранак?» паэту была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР. І ў няпростыя гады перабудовы, апошнія гады свайго жыцця, Панчанка заставаўся сумленным, шчырым творцам. Пра гэта сведчыць і «Паэма сораму і гневу», якая выклікала ў свой час сапраўдны грамадзянскі розгалас…

А Рыгор Бярозкін і ў 1958 годзе, нягледзячы на ўсё тое, што не давала магчымасці выказацца напоўніцу адкрыта, бачыў перад сабою ўсю веліч панчанкаўскай паэзіі: «Паэзія Панчанкі апошніх год не легкадумна-бадзёрая — яна ведае сапраўдную цану чалавечага шчасця і дзейсна змагаецца за вернасць і шчырасць, за дружбу і давер. Няма ў вуснах паэта характарыстыкі больш знішчальнай, чым тая, якую ён даў аднаму са сваіх знаёмых у вершы "Смеласць": "І так: на дні збаяцца тройчы, // Разоў пятнаццаць памыліцца // І пазіраць сябрам у вочы, // Нібы на допыце ў міліцыі…" Ёсць яшчэ адна рыса ў творчасці Панчанкі, якая робіць яго новыя вершы на дзіва сугучнымі сённяшняму перыяду ў развіцці савецкага грамадства: гэта — узмоцненая цікавасць паэта да рэальна-бытавых праблем нашага жыцця, да тэм маральна-этычнага парадку…»

Мікола БЕРЛЕЖ,
Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ

«Свята на Каляды», 2007 г.

У полі зроку рэаліста

Светлыя пачуцці — выраз, здаецца, адзін з самых зразумелых. Ён не мае патрэбы ў тлумачэннях (хоць, магчыма, і не для тых знаўцаў, якім неабходна «бачыць» усё семантычае поле і ведаць ледзь не матэматычнае абгрунтаванне любога словазлучэння), выкарыстоўваецца і ў мастацкай літаратуры, і ў штодзённасці. Зусім няхітры і ў нечым трывіяльны, пазбаўлены яркай афарбоўкі. Аднак якія асацыяцыі выклікаюць «светлыя пачуцці» ў звязцы з выяўленчым мастацтвам? Іх паспрабаваў перадаць мастак Віктар Барабанцаў на персанальнай выстаўцы «Пачуццяў светлых прыгажосць». Экспазіцыя заслужанага дзеяча культуры, прымеркаваная да яго 75-годдзя, працуе ў Нацыянальным мастацкім музеі.

Невыпадкова тут згадваецца тэма сэнсаў і значэнняў: на адкрыцці выстаўкі Віктара Барабанцава прысутнічалі і мастакі слова, у ліку якіх — сябры творцы Віктар Шніп і Людміла Рублеўская. Першы — паэт, намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура», галоўны рэдактар часопіса «Полымя» — перад тым, як прачытаць уласныя вершы, настраёва блізкія да работ Віктара Барабанцава, падкрэсліў:

— У яго карцінах — уся Беларусь, усё наша, беларускае. Любоў, паэзія, прыгажосць, вечнасць, непаўторнасць — менавіта гэта зафіксаваў мастак. Ад твораў ідзе святло, натхненне... Калі глядзіш на палотны Віктара Барабанцава, хочацца пабываць каля гэтых храмаў, прайсціся па гэтых дарогах... І тое, што ўсё напісана з любоўю і душой, перадаецца гледачу.

Выстаўка ў Мастацкім складаецца прыкладна з трох дзясяткаў работ. Ключавымі сюжэтамі сталі беларускія народныя святы і жыццё простых людзей з усім тым, што іх акружае. Зразумела, важны кампанент тут — пейзажы, якія паказваюць віды такіх звычайных і адначасова непаўторных мястэчак і вёсак («Восень у Залессі», 2019; «На возеры Свір», 2022; «Млын», 2019; «Вясна ў Івянцы», 2006).

У полі зроку Віктара Барабанцава — рэлігійны бок жыцця. Праз вобразы людзей, якія рыхтуюцца або адзначаюць тое ці іншае свята, цэркваў, да якіх заўсёды вядуць дарогі, жывапісец нагадвае, наколькі глыбокія карані веры беларусаў. (Дарэчы будзе вартым тут сказаць, што Віктар Барабанцаў яшчэ і манументаліст, яго роспісы і мазаікі ўпрыгожваюць цэрквы і розныя будынкі ў многіх гарадах краіны.) І ўсё гэта перадаецца з вялікай надзеяй на тое, што застанецца ў вяках, не страціцца, не разбурыцца ліхалеццем нешта важнае, без чаго беларусы стануць духоўна беднымі. Тое ж можна сказаць і пра беларускую традыцыйную культуру, клопат аб якой, відавочна, не быў і не будзе чужы творцу. Пра гэта кажуць знаёмыя гледачу і свежыя работы на выстаўцы («Дудар», 2012; «Свята на Каляды», 2007; «Гуканне вясны», 2022; «Напярэдадні свята», 2021; «Берагіня», 2022).

— Віктар Барабанцаў — мастак, які выдатна бачыць і ўмее перадаваць вобразы, — адзначыла падчас адкрыцця выстаўкі намеснік старшыні Саюза мастакоў Беларусі мастацтвазнаўца Наталля Шаранговіч. — Гэтая выстаўка вельмі прамяністая, ад яе застаецца адчуванне святла і цяпла. Мы ўсе ведаем, што Віктар Барабанцаў вядомы і іншымі сваімі работамі… Ён родам з Гомельскай вобласці, перажыў чарнобыльскую трагедыю. Адным з першых паехаў у зону, каб занатаваць тое, што адбылося, стварыў там шмат пранізлівых, вельмі моцных і складаных цыклаў, звязаных з трагедыяй яго роднай зямлі. Мабыць, толькі чалавек, які перажыў вялікую трагедыю, можа так светла, добразычліва і адкрыта ўспрымаць жыццё.

«Мастакі на пленэры», 2022 г.

«Сяброўская сустрэча ў Баярах», 2006 г.

Мастак працуе ў традыцыйным рэалістычным кірунку, які ў яго выпадку мае свае асаблівасці. Найперш — багацце фарбаў і адсутнасць мудрагелістасці. Адны з найбольш яркіх работ у экспазіцыі — «Каляды ў Строчыцах» (2021) і «Свята на Каляды» (2007). Тэма дазваляе пазабаўляцца з сюжэтамі, вобразамі, колерамі, аднак мастак не пераходзіць мяжу, пасля якой кампазіцыі выглядалі б недарэчна ці неарыгінальна.

Галоўная ж рыса творчасці Віктара Барабанцава, якая кідаецца ў вочы незалежна ад выбранага мастаком жанру, — статычнасць. Выяўляецца яна, зразумела, не ва ўсіх творах: тыя ж калядныя сюжэты, карціны, дзе рух мае істотнае значэнне («Вяселле ў снежні», 2021; «Зімовыя клопаты», 2006; «Восеньскія клопаты», 2006), няхай і не цалкам пазбаўлены гэтай «струны», аднак і злоўжыванне тут адсутнічае. Чаго не сказаць пра большасць твораў мастака, дзе спакой і ціхамірнасць выходзяць на першы план. Гэта выклікае як станоўчыя эмоцыі, тыя самыя «светлыя пачуцці» — пры знаёмстве са шмат у чым роднымі пейзажамі ці адметнымі нацюрмортамі (асабліва вартыя ўвагі «Кветкі Радзімы», 2004), так і непаразуменне — гаворка найперш пра партрэты. Пытанне пра неабходнасць статычнасці ў гэтым жанры, канечне, дыскусійнае, аднак нежаданне аўтара выйсці па-за межы творчага крэда — не на карысць Яго Вялікасці Мастацтву.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Эмоцыі ў фарбах

Да 5 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы (галерэя «Атрыум») працуе выстаўка Андрэя Карпянкова «Прастора колераў». Змест экспазіцыі — серыі абстракцый у жывапіснай тэхніцы дрыпінгу, створаныя аўтарам на працягу апошніх пяці гадоў. Для тых, хто хоць крыху знаёмы з творчасцю мастака і сочыць за ёй, выстаўка не стане адкрыццём. Так, адносна нядаўна творы Андрэя Карпянкова сталі часткай вялікага выставачнага праекта «Мембрана», які размяціўся ў сценах арт-гасцёўні «Высокае мѣста».

Андрэй Карпянкоў — мастак, удзельнік міжнародных мастацкіх пленэраў, выставачных праектаў, выкладчык Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава, сябра Беларускага саюза мастакоў. Не стане чымсьці новым для чытачоў і патэнцыяльных гледачоў той факт, што ключавы вобраз у работах мастака — кветкі. Гэта і гімн жыццю, і сімвал дасканаласці і прыгажосці прыроды, і транслятар эмоцый чалавека. Для мастакоў яны не ў апошнюю чаргу — спосаб падзяліцца радасцю і цеплынёй, праілюстраваць свае стасункі з сусветам. Кветкі — невычэрпная крыніца натхнення: сімвалізм прыгожых квітнеючых раслін заўсёды прысутнічаў у культурах абсалютна розных краін. Пры любых абставінах кветкі суправаджаюць чалавека ад нараджэння да скону. Паглыбіцца ў тэму дапаможа фларыяграфія, якой прысвечана безліч даследаванняў і якая сёння можа шмат што расказаць… Магчыма, у выпадку з творамі Андрэя Карпянкова ўсе гэтыя словы залішнія: не так часта на палотнах мастака можна пазнаць пэўную кветку. Збольшага тут працуюць метады здагадак ці персанальных асацыяцый. Абстракцыя на тое і абстракцыя.

«Марозны дзень», 2018 г.

Дапаўняюць экспазіцыю палотны з выявамі квітнеючага сада — яшчэ адзін складнік, на інтэрпрэтацыю якога не трэба шукаць час: усё ўжо зроблена да нас. Асноўны — вобраз дрэва, што, як усё на палотнах Андрэя Карпянкова, пазнаецца толькі дзякуючы колеру, заўсёды нетыповаму. Дрэва, зразумела, адсылае да філасофскага пераасэнсавання пытанняў пра час, рост, крохкасць і моц жыцця, яго зменлівасць і пастаянства. Здаецца, гэта вечныя тэмы, якія развівалі найлепшыя мастакі, аднак радуе, што сучаснікі таксама не баяцца іх закранаць, галоўнае, адмысловым спосабам.

Наогул, мастаку блізкі экспрэсіянізм. У гэтай плыні ён шукае неабходныя форму, фактуру, лінію, колер… У выніку паўстаюць не проста жывапісныя абстрактныя работы, а пачуцці і эмоцыі ў фарбах. Наколькі яны каштоўныя і неабходныя, вырашыць сам глядач, якому, магчыма, якраз гэтага можа і не хапаць. Так ці інакш, «Прастора колераў» здольна пакінуць адчуванне, што Андрэй Карпянкоў працягвае пісаць адзін і той жа твор, даводзячы яго да неабходных пачуццёвасці і дасканаласці.

«Святло белых кветак», 2021 г.

За гэтымі назіраннямі і разважаннямі, якія, дарэчы, ні на што не прэтэндуюць, згубілася асноўная тэма, змешчаная ў назве выстаўкі. «Прастора колераў» — толькі так можна было назваць падобны праект. Менавіта дзякуючы розным фарбам выстаўка выглядае цэласнай. Колеры дапаўняюць адзін аднаго, зліваюцца, спрачаюцца і спаборнічаюць за ўвагу кожнага. Прырода — кветкі — і колер — алейныя фарбы — што найлепш можа дапамагчы пачуць сябе і іншых?

Яўгенія ШЫЦЬКА

Самнамбулічны вопыт

Падышоў да завяршэння X юбілейны *open-air* фестываль нямога кіно і сучаснай музыкі «Кінемо» ў Скульптурным дворыку Мемарыяльнага музея-майстэрні Заіра Азгура ў Мінску. Арганізатарам паказаў выступіла каманда ўлюбёнага беларускімі кінаманамі праекта *Cinemascope*. Для гледачоў падрыхтавалі разнастайную праграму: ва ўнутраным дворыку музея дэманстраваліся нямыя фільмы класікаў сусветнага кінематографа, агучаныя айчыннымі музыкантамі. Апошні сеанс з запланаваных чатырох прайшоў учора, таму спяшаемся падзяліцца з вамі ўражаннямі.

Чорна-белая музыка

Паводле сцвяржэння заснавальнікаў, «Кінемо» — адзіны ў Беларусі штогадовы фестываль падобнага роду. Сваімі задачамі арганізатары бачаць папулярызацыю і пераасэнсаванне класікі нямога кіно сродкамі сучаснай музыкі. Вось ужо на працягу дзесяці гадоў фестывальныя перфомансы паспяхова спалучаюць у сабе кінапаказы з музычнымі канцэртамі. Прычым падыход сур'ёзны: цягам некалькіх месяцаў кампазітары складаюць арыгінальнае музычнае суправаджэнне да фільмаў праграмы, рэпетуюць з выканаўцамі і затым прадстаўляюць яго гледачам падчас жывых выступленняў.

Афішу мерапрыемства вянчае сілуэт прывіднай павозкі са знакамітага шведскага фільма 1921 года «Вазніца». І гэта зусім не выпадкова: дэманстрацыя фантасмагарычнай карціны, пастаўленай класікам нямога кіно Віктарам Шострамам, стала кульмінацыйнай падзеяй сёлетняга фестывалю. Менавіта гэтая стужка была адорана найбольш падрабязным саўндтрэкам з самай складанай партытурай — карцінцы акампаніраваў цэлы квартэт (фартэпіяна, скрыпка, саксафон і флейта). Да таго ж такая ценявая гульня настройвае на патрэбны лад і недвухсэнсоўна намякае, якіх фільмаў чакаць гледачу на фестывалі.

Захапляльны атракцыён

Адкрыўся летні кінатэатр ва ўнутраным дворыку музея-майстэрні паказам карціны 1924 года «Шэрлак малодшы» рэжысёра Бастэра Кітана. Дарэчы сказаць, без культавага амерыканскага камедыянта пачатку мінулага стагоддзя не абыходзіцца амаль ніводны сезон «Кінемо». І ўжо стала добрай традыцыяй пачынаць кінапаказы менавіта з яго карцін, якіх за дзесяцігоддзе існавання фестывалю гледачам давялося ўбачыць (і пачуць) шмат. Фільмаграфія Бастэра Кітана — ідэальны пункт уваходу ў нямое кіно. Захапляльны атракцыён, незабыўнае відовішча, яго фільмы, паверце, і сёння глядзяцца жыва.

Сюжэт «Шэрлака малодшага» — адной з найвядомейшых стужак мэтра — будуецца вакол гісторыі маладога кінамеханіка з правінцыйнага гарадка. Няўдачлівы фанат дэтэктываў усе вольныя гадзіны бавіць за чытаннем раманаў Артура Конана Дойла, марачы аб кар'еры сышчыка. Ды сэрца самотнага летуценніка працята стралою кахання. На няшчасце, за ўвагу выбранніцы змагаецца яшчэ адзін мужчына — несумленны чалавек. Сапернік падстаўляе наіўнага юнака, абвінавачваючы таго ў выкраданні гадзінніка будучага цесця. Не здолеўшы апраўдацца, герой увечары засынае і бачыць цікавы сон.

У сне хлопец трапляе на кінаэкран і пад пільным позіркам гледачоў бліскуча, у адрозненне ад рэальнага жыцця, раскрывае справу аб крадзяжы каштоўных караляў. Фільм, стаўшы адным з першых прыкладаў кіно ў кіно, даследуе саму прыроду кінематографа, праводзячы, ці не ўпершыню ў гісторыі гэтага мастацтва, паралель паміж снамі і «рухомымі карцінкамі». Узаемасувязь падсвядомага і «фільмічнага» разумныя людзі (як апалагеты псіхааналізу, так і кінатэарэтыкі з рэжысёрамі) адзначалі, вядома, і раней. Ды Кітан у многіх сэнсах стаў першапраходцам на полі анірызму (з грэч. — сон, снабачанне).

Пасля выхаду карціны на экраны за яе з жарсцю ўхапіліся разнашэрсныя разумнікі, у прыватнасці тэарэтыкі сюррэалізму паспяшаліся запісаць яе ў свой стан. Пра фільм пісалі як пра «адно з самых чароўных снабачанняў у гісторыі кінамастацтва». І, хаця стужка сапраўды заходзіць на тэрыторыю сюррэальнасці (прычым робіць тое вельмі ўпэўнена), усё ж ёй не хапіла моцы маніфестацыі, каб зрабіцца галоўным сюррэалістычным творам у кіно (такі з'явіцца крыху пазней, і будзе гэта праграмны «Андалузскі сабака» 1929 года). Застаючыся, аднак, таленавітай і дасціпнай буфанадай, карціна замацавалася ў гісторыі.

Сімфонія жаху

Зрэшты, фільм адкрыцця, па ўсім відаць, павінен быў настроіць гледачоў зусім не на хвалю пацешнай камедыі. Бадай, цэнтральная ў сёлетнім «Кінемо» тэма «тагасветнага». Пад яе падпадаюць як перамяшчэнні ў снах і на той бок экрана, так і літаральна вандроўка па тым свеце. Следам за бесклапотным Бастэрам Кітанам у дворыку сталічнага музея глядзелі класіку нямецкага экспрэсіянізму «Насферату, сімфонія жаху» Фрыдрыха Вільгельма Мурнау, выпушчаную ў 1922 годзе. Тое, што пачыналася як вольны парафраз стокераўскага «Дракулы», стала ў выніку адным з найлепшых кінаўвасабленняў рамана ва ўсе часы.

1838 год. Эпідэмія страшэннай чумы абрынулася на неіснуючы еўрапейскі горад Вісбарг. Каб даведацца аб прычынах трагедыі, гледачам давядзецца разам са служачым агенцтва па нерухомасці Томасам Хутэрам адправіцца ў таямнічы замак у Карпатах. Па ўсіх канонах у замку гаспадарыць нечысць — злавесны вампір Насферату (чытай: граф Дракула). Цікава, што дзякаваць за многія з тых праславутых канонаў трэба якраз карціне 1922 года. Яна ні больш ні менш як задала правілы выяўлення вампіраў і ўсёй іх замагільнай атрыбутыкі на кінаэкране. Дзякуючы фільму крывасмокі жывей за ўсіх жывых і сёння!

Больш за тое, дзівоснае палатно нямой эпохі выклікала да жыцця такую з'яву, як кінаэкспрэсіянізм. Па вялікім рахунку, менавіта з яе пачынаецца гісторыя гэтага надзвычай уплывовага кірунку мастацкай творчасці. Пры дапамозе трукаў з ценямі і асвятленнем Фрыдрыху Вільгельму Мурнау ўдалося дасягнуць на экране прывабнай, але разам з тым і жудаснай атмасферы начнога кашмару. Заклаўшы асновы стылю, які беспаваротна змяніў ход гісторыі, рэжысёр натхніў не аднаго творцу на стварэнне шэдэўра. Словам, не было б «Насферату» — не мела б чалавецтва і дзясяткаў іншых вялікіх карцін.

Магчыма, толькі пазнейшае прызнанне дапамагло выратаваць стужку ад поўнага знішчэння. Рэч у тым, што, нягледзячы на перасцярогі аўтараў (былі заменены імёны герояў, месца дзеяння і іншыя дэталі), цяжбаў наконт аўтарскіх правоў пазбегнуць не атрымалася. Спадчыннікі Брэма Стокера (аўтара рамана «Дракула») узбудзілі іск супраць кампаніі, якая выпусціла фільм, і суд пастанавіў знішчыць усе копіі карціны. Тым не менш некалькі з іх цудам захавалася, і цяпер, у нашы дні, мінскія сінефілы маюць магчымасць на ўласныя вочы ўбачыць шэдэўр нямога кіно, дакрануцца да гісторыі і пачуць сімфонію жаху.

Кадр з фільма «Вазніца», 1921 г.

Фота са здымак фільма «Малодшы брат», 1927 г.

Прывіды мінулага

На мінулым тыдні наведвальнікі фестывалю глядзелі іншую класіку, на гэты раз шведскую. «Вазніца» 1921 года Віктара Шострама апавядае гісторыю небаракі Давіда Хольма, які гіне падчас п'янай бойкі на могілках у навагоднюю ноч. Паводле народнага павер'я, распаўсюджанага сярод тутэйшых, чалавек, які загінуў пазней за ўсіх у годзе, асуджаны год наступны кіраваць прывіднай павозкай, што перапраўляе душы на той свет. Прачнуўшыся побач са сваім целам, Хольм пачынае пераасэнсоўваць уласнае жыццё, згадваючы пераломныя моманты ў ім. Ён раскайваецца, пасля чаго герою даецца другі шанс.

Фільм аказаў значны ўплыў на кінематаграфістаў наступных пакаленняў. Так, Віктар Шострам фактычна адкрыў свету прыём флэшбэку і шведскі кінематограф як такі. Асобныя сцэны з «Вазніцы» пераклікаюцца са сцэнамі культавага фільма «Ззянне» Стэнлі Кубрыка, іншыя — адразу з некалькімі работамі Інгмара Бергмана. Улюбёны Бергманам Віктар Шострам нават сыграў галоўную ролю ў знакамітай «Сунічнай паляне» 1957 года… Завяршылася праграма фестывалю нямога кіно і сучаснай музыкі паказам фільма «Малодшы брат» (1927) з Гаральдам Лойдам. Яго паказвалі і ў мінулыя гады.

Бернард ЗАТЫЛКІН

Кадр з фільма «Шэрлак малодшы», 1924 г.

Кадр з фільма «Насферату, сімфонія жаху», 1922 г.

Якім планаваўся папярэдні скарынаўскі юбілей?..

Не за гарамі 2025 год… Краіна будзе адзначаць 535 гадоў з дня нараджэння легендарнага ўсходнеславянскага першадрукара Францыска Скарыны (каля 1490—1551). І яшчэ ў 2025-м — 500 гадоў з часу выдання скарынаўскага «Апостала», якім завяршылася шматкніжжа, народжанае друкарскім, асветніцкім талентам нашага славутага суайчынніка.

Францыска Скарыну па праве называюць і пісьменнікам. Найвыдатнейшы гістарычны дзеяч Беларусі (пра што сведчыць і маштаб ушанавання яго ў назвах вуліц, плошчаў, навучальных устаноў, усталяванне ў незалежнай і суверэннай Рэспубліцы Беларусь узнагарод з яго імем — медаль Францыска Скарыны і ордэн Францыска Скарыны, а яшчэ — помнікі ў розных гарадах Беларусі) пакінуў такі выразны след, што ўплывы яго распаўюджваюцца і будуць распаўсюджвацца на стагоддзі… І не дзіўна, што да чарговай скарынаўскай даты Саюз пісьменнікаў БССР звяртаўся ў ЦК Кампартыі Беларусі з канкрэтнымі прапановамі, якія лічыў патрэбнымі рэалізаваць у знак ушанавання першадрукара.

Ліст у ЦК КПБ падпісаны сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Валерыем Скварцовым. Тут варта крыху нагадаць, што Валерый Скварцоў — зусім не пісьменнік. Працаваў вызваленым сакратаром парткама Белтэлерадыёкампаніі — у тым ліку і ў часы кіраўніцтва ёй Генадзем Бураўкіным. У Саюз пісьменнікаў прыйшоў сакратаром па арганізацыйных пытаннях. Была і такая пасада. Пасля, ужо на пачатку новага стагоддзя, некалькі месяцаў паспеў пакіраваць Белтэлерадыёкампаніяй. Але раптоўна памёр…

Паўтары старонкі тэксту, адно пасяджэнне, дзе разглядалася канкрэтнае пытанне («Аб падрыхтоўцы да 500-годдзя беларускага першадрукара, вучонага, асветніка і культурнага дзеяча, перакладчыка і пісьменніка эпохі Адраджэння Францыска Скарыны») — і цэлая праграма, разлічаная амаль на два гады працы! Супольнай, заўважым!.. Пісьменніцкая арганізацыя выклала пазіцыю творчай грамадскасці, выклала сваю пазіцыю… І помнік у выніку з'явіўся. Не адразу, але ўсё ж… І музей гісторыі кнігадрукавання заснавалі. І гомельскаму ўніверсітэту надалі імя першадрукара.

Фота БелТА.

Помнік Францыску Скарыну каля Нацыянальнай бібліятэкі.

19 ліпеня 1988 года Валерый Скварцоў піша ў ЦК: «…Саюз пісьменнікаў БССР, разгледзеўшы пытанне "Аб падрыхтоўцы да 500-годдзя беларускага першадрукара, вучонага, асветніка і культурнага дзеяча, перакладчыка і пісьменніка эпохі Адраджэння Францыска Скарыны", вырашыў прасіць дырэктыўныя органы стварыць юбілейны камітэт па падрыхтоўцы да 500-годдзя Ф. Скарыны. Мяркуем, што на абмеркаванне юбілейнага камітэта неабходна вынесці наступныя пытанні:

а) адкрыць у Мінску помнік Ф. Скарыну, папярэдне аб'явіўшы конкурс;

б) заснаваць музей гісторыі беларускай кнігі, кнігадрукавання імя Ф. Скарыны, дзе будуць кнігі па ўсіх галінах ведаў;

в) назваць імем Ф. Скарыны вуліцу ў цэнтры Мінска, замест існуючай маленькай на ўскраіне горада;

г) надаць імя Ф. Скарыны Гомельскаму ўніверсітэту і ўстанавіць студэнцкую прэмію яго імя;

д) арганізаваць да юбілею Ф. Скарыны мастацкую выстаўку;

е) правесці конкурс на найлепшы мастацкі твор, прысвечаны Ф. Скарыну і яго паслядоўнікам;

ж) заказаць настольныя бюсты Ф. Скарыны для серыйнай вытворчасці;

з) выпусціць юбілейныя медалі, маркі, канверты;

к) правесці вялікае рэспубліканскае свята ў 1990 г., агульнагарадскі вечар у Мінску і свята кнігі ў Полацку;

м) правесці юбілейную сесію АН БССР;

н) запрасіць на ўрачыстасці пісьменнікаў з ЧССР, ПНР, Літвы;

о) міністэрству народнай асветы БССР правесці скарынінскую школьную алімпіяду;

п) даручыць СП БССР і АН БССР арганізаваць спецвыпуск юбілейнай газеты, прысвечаны Ф. Скарыну».

Паўтары старонкі тэксту, адно пасяджэнне, дзе разглядалася канкрэтнае пытанне («Аб падрыхтоўцы да 500-годдзя беларускага першадрукара, вучонага, асветніка і культурнага дзеяча, перакладчыка і пісьменніка эпохі Адраджэння Францыска Скарыны») — і цэлая праграма, разлічаная амаль на два гады працы! Супольнай, заўважым!.. Пісьменніцкая арганізацыя выклала пазіцыю творчай грамадскасці, выклала сваю пазіцыю… І помнік у выніку з'явіўся. Не адразу, але ўсё ж… І музей гісторыі кнігадрукавання заснавалі. І гомельскаму ўніверсітэту надалі імя першадрукара. Увогуле, у нашай краіне прыгожыя ўніверсітэцкія назвы: у Магілёве ўніверсітэт носіць імя Аркадзя Куляшова; у Гродне — імя Янкі Купалы; у Брэсце — універсітэт імя А. С. Пушкіна… Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт носіць імя І. П. Шамякіна. Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт — імя Максіма Танка. Чаму, напрыклад, Палескі дзяржаўны ўніверсітэт, які працуе ў Пінску, не назваць імем народнага песняра Беларусі Якуба Коласа?!

Зварот пісьменнікаў у ЦК КПБ адносна дэталізацыі ў мерапрыемствах па святкаванні 500-годдзя Францыска Скарыны — праява грамадскай пазіцыі літаратараў, іх клопат пра тое, каб не забыліся… Зразумела, што вялікія справы так і трэба рабіць — талакой, папярэдне абмеркаваўшы на розных узроўнях.

Напярэдадні — 535-годдзе Скарыны, 500-годдзе выдання «Апостала»… Аб'яднацца б усім зараз і выкласці не меней цікавую агульную юбілейную праграму… Такая падрыхтоўчая праца нагадвае пра гістарычны грунт нашай Айчыны, даводзіць моладзі, адкуль, з якіх вытокаў пайшла наша культура. Тым болей, што цяпер новыя ініцыятывы здольны абаперціся на зробленае нашымі папярэднікамі. У тым ліку — і напрыканцы XX стагоддзя.

Кастусь ЛЕШНІЦА

Абудзіць сэрцы

Арганізацыйная работа ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі ў ранейшыя часіны ў многім залежала ад узгаднення самых, здавалася б, зразумелых і бездакорных мерапрыемстваў з ЦК Кампартыі Беларусі. У гэтым найперш цалкам праяўлялася арганізаванасць тагачаснага жыцця з пункту гледжання ідэалагічных, дзяржаўных пазіцый. Творцы былі прывучаны да вырашальнага, галоўнага меркавання партыі. Шукаць у гэтым негатыў не выпадае, асабліва сёння, калі не хапае ініцыятыў, навацый, увагі да пэўных агульнадзяржаўных, агульнаграмадскіх традыцый з боку саміх творцаў…

Першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР паэт Ніл Гілевіч пісаў 28 жніўня 1988 года ў ЦК КПБ. Ліст даволі кароткі: «У шэрагу мерапрыемстваў, прысвечаных 70-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі, плануецца і сёлетняе рэспубліканскае свята паэзіі. Саюз пісьменнікаў Беларусі прапануе правесці яго ў Акцябрскім раёне Гомельскай вобласці — на зямлі, пазначанай слаўнымі рэвалюцыйнымі падзеямі, перш за ўсё існаваннем знакамітай Рудабельскай рэспублікі.

На свята, якое стала ўжо традыцыяй, будуць запрошаны госці з Масквы, Ленінграда, з суседніх саюзных рэспублік.

Свята прапануем правесці 15 альбо 16 кастрычніка (субота ці нядзеля).

Просім Вашага садзеяння ў правядзенні гэтага мерапрыемства».

12 верасня Анатоль Бутэвіч, які тады працаваў у ЦК КПБ, накладвае рэзалюцыю: «З Гомельскім абкамам КПБ (т. Бабыр С. П.) і Акцябрскім райкамам партыі (т. Судас Н. М.) пытанне ўзгоднена. Саюзу пісьменнікаў БССР паведамлена. Ан. Бутэвіч. 12. 9. 88».

Пэўна ж, свята правялі годна, дастойна. Яно стала адной з масавых асветніцкіх «кропак» у шэрагу іншых паэтычных свят — у Вязынцы, Ляўках, іншых адрасах Беларусі. Ды і пісьменнікі, якія працавалі ў іншых відах мастацкай літаратуры, спрычыніліся да мясціны, звязанай з гісторыяй Беларусі. У свой час падзеяй у беларускай літаратуры стала дакументальная аповесць Сяргея Грахоўскага «Рудабельская рэспубліка». Купалаўскі тэатр і Гомельскі абласны драматычны тэатр паставілі спектаклі па гэтым творы. А ў 1972 годзе быў створаны аднайменны кінафільм.

Надта не пералічваючы зараз адрасы, якія прыцягнулі ўвагу пісьменнікаў у звязку з тэматычнай прасторай гераічнай гісторыі Беларусі (Алесь Савіцкі пісаў пра антыфашысцкае падполле ў Обалі; Максім Танк — пра паўстанне рыбакоў на Нарачы; героямі твораў многіх пісьменнікаў у 1950—1980 гады станавіліся самыя розныя адрасы гераізму і мужнасці народа Беларусі, народаў постсавецкіх краін у Вялікую Айчынную вайну), варта было б задумацца пра тое, што ў адным клопаце маглі б сысціся і памяць пра вайну, мужнасць нашых прашчураў, і памяць пра мастакоў слова.

Тых мастакоў, хто ваяваў і зброяй, хто і вынайдзеныя словы скіраваў на выхаванне ў чытача патрыятычных пачуццяў. Літаратурныя святы, пагадзіцеся, маглі б прайсці літаральна па ўсіх раёнах нашай краіны. Чулыя паэтычныя радкі пра святло і мужнасць дапамаглі б абудзіць сэрцы моладзі, прымусілі б паразважаць пра цану Перамогі, пра тое, якімі намаганнямі даюцца сёння мір і спакой.

Сяргей ШЫЧКО

Вучыў спяваць… дрэва

Ні для каго не было асаблівым сакрэтам, што цар Аляксей Фёдаравіч задумаў узводзіць за нейкіх сем вёрст ад сталіцы, на правым беразе Масквы-ракі, палац. Аднак чуткі спраўдзіліся толькі тады, калі сталі пераводзіць усіх майстроў, якія будавалі Васкрасенскі сабор у Істры, у сяло Каломенскае. Пра гэта паведаміў менш за месяц да новага 1667 года пасланец гасудара: «Велено… в Воскресенском монастыре людей иноземцев золоторей и серебреников и резцов и иных всяких дел мастеров, которые были и ныне есть в Воскресенском монастыре, переписать и выслать их с женами и с детьми и со всем их животы, дав им подводы, и мастеровым людем именную роспись прислать в оружейную палату».

Арсеній старац — майстравы малец

Указ усе выслухалі моўчкі. Толькі пасля таго, як было загадана разысціся, пачалі збірацца невялікімі купкамі. Клім Міхайлаў апынуўся поруч з Арсеніем. Старцам Арсеніем, як яго ўсе называлі. І за ўзрост паважны так клікалі. Ды і з-за вялікага разьбярскага майстэрства так ставіліся. Паспеў Арсеній папрацаваць і ў Куцеінскім манастыры пад Оршай. Але асабліва праславіўся ў Маскве.

У купцы гэтай сабраліся ўсе знаёмыя Кліму. Пераважна тыя, каго ў Маскве беларусцамі клікалі: Герасім Акулаў, Андрэй Іваноў, Фёдар Нікалаеў, Давыд Паўлаў… Хто раней сюды перабраўся, хто нядаўна. Усе, як і сам, колісь каталікамі былі, але прынялі праваслаўе. Пабраліся з маскоўскімі дзяўчатамі. У сям'і ж лепей, калі суладдзе, спакой, узаемаразуменне ва ўсім. А аднолькавая вера блізкіх людзей яшчэ лепш аб'ядноўвае. Аднак была і іншая прычына, чаму праваслаўнымі сталі. У Маскве прапаведавалася і ўсяляк падтрымлівалася праваслаўе. Яно з'яўлялася неафіцыйнай дзяржаўнай рэлігіяй. Да такіх вернікаў ставіліся з асаблівай павагай. Майстры нароўні з мясцовымі маглі разлічваць на ўдзел у важных работах. Называлі гэтыя работы «гасударавы справы».

Старац Арсеній, разумеючы, што ад яго чакаюць большай пэўнасці з пераездам, патлумачыў:

— Адпраўляюць усіх нас у распараджэнне Аружэйнай палаты. Там вырашаць, каго пакінуць у Крамлі, а каго адразу накіраваць у Каломенскае.

І адразу ўнёс пэўнасць:

— Крамлёўскіх разьбяроў загадана ўзначаліць мне. Я сказаў, што ўсіх вас бяру да сябе.

«Иноземец Шклова города»

Тым часам і ў Крамлі не сядзелі склаўшы рукі. Клапаціліся пра размяшчэнне майстроў, якія прыедуць. Каб своечасова прыступілі да работы, патрабавалася шмат драўніны самага высокага гатунку. Яе нарыхтоўвалі ў лясах на Браншчыне, на рэках Угры, Жыздры, Ацэ. Кіраўніцтва Аружэйнай палаты старалася ўсё загадзя прадугледзець. Захацела і лепш пазнаёміцца з тымі, хто прыбывае. Кажучы па-цяперашняму, кожнаму прапанавалі напісаць аўтабіяграфію. Клім Міхайлаў, як і іншыя, атрымаў паперу, узяў гусінае пяро. Грамату ведаў, ды і розныя распіскі даводзілася пісаць.

Падсунуў аркуш бліжэй. Абмакнуў пяро ў чарніла і пачаў выводзіць літару за літарай. Засведчыў, што «он, Климка Михайлов, родом иноземец Шклова города, делает резное дело под золото да столярное дело. А в первую службу взял его добровольно в Шклове боярин князь Григорий Семенович Куракин, и жил он у него в Москве без крепости с год, и женил он его у себя на дворовой своей девке Анютке, и женясь пожил у него с год, и отдал его бывшему патриарху Никону на время, тоиму ныне одинадцать лет. И с тех мест жил он в Воскресенском монастыре восем лет».

Жыў «без крепости» — значыць, не быў прыгонным. Адказаў Клім і на пытанні, зададзеныя яму пры залічэнні ў Палату. Безумоўна, таго не ведаў, што гэтым сведчаннем пакінуў для гісторыі пра сябе, хай і скупыя, звесткі. Але ж пра іншых майстроў і таго не захавалася.

Промні як блікі полымя

Паходзіў ён, бадай, з сям'і гарадскога рамесніка. Магчыма, у яго родзе былі і патомныя разьбяры. Адкуль такое меркаванне? На тэрыторыі цяперашняй Беларусі яшчэ ў XVI стагоддзі развівалася так званая аб'ёмная рэзь. Найперш гэтым славілася Магілёўшчына. Такая рэзь у нечым падобная да скульптуры. Выразаныя элементы яе вылучаюцца на агульным фоне. Гэта стварае ўражанне аб'ёмнасці.

У падобных аб'ёмна-ажурных вырабаў быў і адзін асабліва характэрны элемент — так званыя карнізы, што акаймоўвалі іх. Прысутнічалі прафіляваныя рамкі. Яны пакрываліся папярочнымі, не надта глыбокімі жалабкамі. Такімі яны рабіліся свядома, каб паверхня набывала хвалепадобны выгляд. Да ўсяго, падобныя драўляныя вырабы аздабляліся сусальным золатам.

У Масковіі ж яны пакрываліся па спецыяльнай тэхналогіі — ляўкас. Дзякуючы вялікаму майстэрству, ствараліся сапраўдныя разьбярныя шэдэўры, што захаплялі сваёй непаўторнасцю. У сонечныя дні, калі промні адбіваліся на паверхні, было такое ўражанне, што калышуцца блікі полымя. Выкананыя па такой тэхналогіі карнізы і рамкі называліся флеманавымі дарожнікамі.

Паралельна была распаўсюджана і фігурная рэзь. Але да таго, што зроблена ў гэтым відзе мастацтва на Беларусі і ў Расіі, больш падыходзіць трэцяя назва — «беларуская рэзь». Менавіта "беларусцы" прынеслі яе сакрэты ў Маскву. Там жа яшчэ да сярэдзіны XVII стагоддзя распаўсюджванне мела больш простая разьба — плоская рэльефная. У параўнанні з беларускай рэззю яна не проста прайгравала. Адрознівалася як неба ад зямлі. Гэтую адметнасць беларускай рэзі дакладна прыкмеціў вядомы расійскі археолаг і гісторык Іван Забелін. У першай кнізе свайго трохтомніка «Хатні быт рускіх цароў» пісаў: «…флемская з высокім рэльефам разьба больш падобна да скульптуры з дрэва і адыходзіць ад тых узорных парэзак, якія пакрывалі раней толькі паверхню дошкі. Новыя прыёмы ў рабоце ператваралі дрэва ў суцэльны ўзор, што складаўся з хітрых перапляценняў розных раслінных і арнаментных матываў, у склад якіх уваходзілі кветкі, плады, ягады і галоўным чынам вінаградныя лісты і гронкі. А сярод арнаментацый асабліва часта ўжываліся разнастайныя "картушы", гэта значыць рамкі, накладзеныя адна на адну, з мудрагеліста перавітымі ў розныя бакі краямі і выемкамі».

Фота з сайта wikiwand.com

Іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра.

Не абышлося і без цяжкасцей

Клім Міхайлаў, натуральна, не ведаў, як гэтая рэзь называецца, але дасканала валодаў яе сакрэтамі. Пераняў іх ад шклоўскіх майстроў. Імі маглі быць і яго бацька, сваякі. Аднак чаму, у такім разе, Куракін не ўзяў і іх у Маскву? Відаць, таму, што яму быў патрэбен разьбяр не толькі таленавіты, але і малады. Навошта ў Маскву пажылога ці старога чалавека?

Як відаць са сведчання Кліма, у Маскву ён прыехаў халастым. А ў той час жаніліся ці выходзілі замуж рана. Зыходзячы з гэтага, можна прыкладна вызначыць, калі пакінуў Шклоў. Паколькі палац у Каломенскім пачаў узводзіцца ў 1667 годзе, а на гэты час у суседняй дзяржаве майстар знаходзіўся прыкладна трынаццаць гадоў, значыць, прыехаў каля 1654 года. Магло яму быць гадоў дваццаць. Ці крыху менш. Можа, нават і больш, але не нашмат. Атрымліваецца, што нарадзіўся недзе каля 1634 года.

Куракін, адчуўшы, што не памыліўся ў ім, усяляк падтрымліваў. На такі клопат Клім адказваў удзячнасцю. У доме яго гаспадара з'явілася дыхтоўная мэбля. Прыгожымі ўзорамі пакрыліся ліштвы вокнаў, карнізы. Але Міхайлаў сутыкнуўся і з цяжкасцямі. Для многіх заставаўся чужынцам. Праўда, не ў доме Куракіна, дзе яго ўсе паважалі, а праз два гады, калі апынуўся ў Васкрасенскім саборы.

Па-руску размаўляў слаба. Гэта выклікала ў некаторых маскоўцаў непрыязь. Але куды горш, што доўга не мог навучыцца па-руску пісаць. Найбольшую пагарду праяўлялі тыя, хто атрымліваў ад яго розныя распіскі. Справа ж уліку вялася належна. Усё фіксавалася ў дакументах. Колькі грошай атрымаў, які харч, якую ўзнагароду займеў. Як і іншыя, распісваўся ў атрыманні так званых кармавых грошай.

Дзякі, беручы паперчыну, на якой ён ставіў свой подпіс, абураліся. Паспрабуй разбярыся, што і да чаго. Іх можна было зразумець. І самі не надта рускай граматай валодалі, а тут: «*Klim Muchaylow karmowyes polhoda wzial*». Праўда, хутка пачаў пісаць і па-руску. Хоць пэўны час пра атрыманне ім грошай за яго сведчылі іншыя.

Львы як жывыя

Калі ж знайшоў паразуменне, працаваў яшчэ з большай ахвотай. Работы ж па-ранейшаму было шмат. Давялося ўжо не толькі выхадныя для гэтага выкарыстоўваць. Ноччу таксама працавалі. Але надаралася і наадварот. І днём сядзелі без справы, бо своечасова не паступалі лесаматэрыялы. Адсутнасць іх асабліва адчулася ў пачатку 1685 года.

Іканастас быў закончаны на тры чвэрці. Наспеў час брацца за так званы «праотеческий» пояс. На ім размяшчаюцца выявы групы старазапаветных святых, якія асабліва ўшаноўваюцца праваслаўнай царквой як выканаўцы волі Боскай у свяшчэннай гісторыі. Раптам высветлілася, што гэты пояс няма з чаго рабіць. Праўда, хутка ўсё ўладзілі. Аднак восенню — новая нявыкрутка: не было вольных рэзчыкаў рабіць клірасы. Давялося тэрмінова шукаць падмогу.

За гэтую работу ўзяўся сам Клім Міхайлаў, а таксама Іван Фядотаў, Івашка Андрэеў ды іншыя. У кастрычніку іканастас, хоць яшчэ быў і не зусім гатовы, паставілі ў храм пакрываць пазалотай. Каб паскорыць работу ў Сцяпана Зіноўева, таксама беларуса, набылі гатовыя «царские резные двери с фрамугой и с сенью доброго мастерства». Пастараліся на славу. Кветкі, садавіна, травы, выкананыя ў разьбе, глядзеліся вельмі натуральна. Выглядалі так, быццам пасаджаны ці толькі што сарваны.

Па ўказе гасударавым разам з Арсеніем і Зіноўевым Клім Міхайлаў працаваў і над стварэннем «Іарданскага прытулку», што ў нечым нагадвае шар. У ім пры богаслужэнні знаходзіўся цар. Таксама ўсё зроблена на славу. Каляровы роспіс і пазалочаная разьба выкананы так, што з'яўляюцца творам мастацтва. Своеасаблівы шэдэўр і Каломенскі палац. Куды ні кінеш вокам, паўсюдна прысутнічае прыгажосць са шматкаляровай аб'ёмнай разьбой. Дакладна прыкмеціў гэтую прыгажосць Сімяон Полацкі, які пабываў на адкрыцці гэтага цуду.

Красоту его мощно есть равняти
Соломоновой прекрасной палате.
Аще же древо зде не есть кедрово,
но стоит за кедр, истинно то слово.
А злато везде пресветло блистает <…>
Дом Соломонов тым славен без меры,
яко ваянны име в себе звери.
И зде суть мнози, к тому и рыкают,
яко живые львы, глас испущают;
Очеса движут, зияют устами,
видится, хощут ходити ногами;
Страх приступити, тако устроенны,
аки живые львы суть посажденны.

У 1681 годзе, пасля смерці Арсенія, Клім Міхайлаў узначаліў работу ўсіх крамлёўскіх рэзчыкаў. Не столькі кіраваў, колькі ўласным прыкладам паказваў, якога высокага майстэрства можна дасягнуць, талент маючы і з душой працуючы. Так было і тады, калі «беларусцы» стваралі іканастас трох цэркваў у Ізмайлаве.

З таго, што захавалася з тварэнняў ураджэнцаў Шклова, — клірас і іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра. А яшчэ рэдкі, адзіны з тых, што зберагліся, паліхромны разны іканастас для палацавай царквы Уваскрэсення Славушчага ў Крамлі. Ён быў замоўлены ўжо царом Фёдарам Аляксеевічам. Відаць, пасля гэтага спакойна дажываў свае апошнія гады. А іканастасы, зробленыя ім, па-ранейшаму радуюць вока. Гэта той цуд, калі здаецца, што само дрэва спявае. Спяваць жа яму яшчэ доўга.

Здзівіў Клім некалі Маскву. Працягвае здзіўляць і сёння. Асабліва гасцей сталіцы Расіі, якім пашчасціць упершыню ўбачыць гэтыя цуды.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Простыя рэчы

Рыбалка па-жаночы

Вольга Базылёва-Клімко — тонкі душэўны лірык, аўтар зборніка паэзіі «Крылы ў шафе» (Мінск, 2002). Мама чатырох дзяцей, сёння Вольга распавядае пра тое, як бавіць час на лецішчы, што дапамагае ёй захоўваць гармонію і раўнавагу.

Вольга Базылёва-Клімко з дзецьмі.

— Рыбалка — традыцыйна мужчынскі занятак. Што паспрыяла «перамяшчэнню» традыцыі ў твае захапленні?

— У дзяцінстве чым толькі не цікавілася: і вышывала, і лялькам шыла, і вязала, нешта майстравала з паперы, кардону, збірала маркі, паштоўкі… Найбольш захаплялася кнігамі, якія ў выніку сталі маёй прафесіяй, бо я літаратурны рэдактар і сама пішу, і маляваннем займалася — нават скончыла дзіцячую мастацкую школу і доўга яшчэ верыла, што буду працягваць атрымліваць мастацкую адукацыю. Не склалася… А пра рыбалку нават не магла падумаць тады, таму што ў маёй сям'і ніхто з мужчын асабліва гэтым не захапляўся. Мяркую, у дзяцінстве далучаюцца да кагорты рыбаловаў толькі тыя дзеці, у каго гэтым займаюцца тата ці дзядуля. А я нават не прысутнічала на рыбалцы!

А вось мой муж Андрэй якраз рос у такой сям'і, дзе бацькі любілі рыбалку. Асабліва яго мама, якая сама неяк дайшла да гэтай справы, вывучала нават кнігі па рыбалоўстве і ўмела часам здзівіць сваім уловам астатніх рыбакоў, як водзіцца, мужчын. Яе добра ведала ўсё наваколле праз гэты нетыповы для жанчын занятак. І мой муж з дзяцінства са сваёй мамай рыбачыў. Ну а я, калі мы пабраліся шлюбам, спачатку падтрымлівала яго маральна, бавячы з ім час на беразе возера, балазе, там стаіць вясковая хата, якая дасталася яму ў спадчыну ад дзеда.

Вудзіць сама я паспрабавала толькі гады тры таму. І аказалася, гэта вельмі захапляльны занятак, які, безумоўна, патрабуе шмат цярпення. А ў мяне цярпення хапае. Што датычыцца «традыцыйна мужчынскага», то, на мой погляд, у апошнія гады жанчыны-рыбаловы ўжо нікога не здзіўляюць, як гэта было ў час маладосці маёй свекрыві. Якраз наадварот — часцей прыязджаюць на наша возера сем'ямі, і жонкі не проста сядзяць побач з мужамі, а таксама актыўна закідваюць вуды.

— Як купляецца рыштунак, што гатуеш на корм рыбам? Што потым робіш з уловам?

— Паколькі я аматар, а не прафесіянал, то і не набываю нейкіх асаблівых прылад. Наогул, усёй гэтай гаспадаркай загадвае муж. Вуды рыхтуе ён, праўда, я ўмею іх і раскласці, і скласці, і адрэгуляваць глыбіню, і насадзіць чацвёрку, так што проста ўзяць вуду і пайсці на рыбалку — не праблема. Вялікіх мэт пакуль не стаўлю: мяне захапляе не аб'ём улову, а сам працэс. Таму з нажыўкамі асабліва не эксперыментую. Накапаць чарвякоў — і наперад. Ну і паколькі з голаду мы не пухнем, не імкнуся рыбу адразу ўсю забіраць і чысціць, каб хоць на юшку, абы спажыць. Звычайна забіраем самыя выбітныя экзэмпляры. Трапляецца карась, плотка, акунь, ёрш… А найчасцей — амерыканскія сомікі, якіх нехта выпусціў у наша возера гадоў дзесяць назад, і яны празмерна распладзіліся. Чысціць рыбу Андрэй, гатую я. Магу суп ці юшку зварыць, пасмажыць, запячы.

— Можа, табе гэты занятак патрэбны, каб неяк папоўніць псіхалагічны рэсурс — пабыць адной, абдумаць нейкія праблемы? Пра што ты думаеш падчас рыбалкі?

— Зараз ёсць моднае слова «антыстрэс». У маім выпадку яно якраз пасуе да рыбалкі. Рыбалка — гэта ціхі занятак, бо, калі будзеш шумець, грымець і тупаць, рыба спляве да іншага берага. Якраз цішыні мне не хапае ў паўсядзённым жыцці, бо ў атачэнні такой вялікай і гучнагалосай сям'і цішыні амаль што не бывае. Вось так пабыць на прыродзе, палюбавацца азёрнымі хвалямі, паслухаць цішыню або спеў птушак, проста падумаць пра што-небудзь сваё… Часам і праблемы абдумаць або ціхенька абмеркаваць з мужам, памарыць ці натхнецца на працу і творчасць.

— Як ставіцца сям'я да твайго захаплення?

— Зразумела, што пры ўсякай магчымасці мы на рыбалцы разам, хаця магу пабыць і адна, і мужа лёгка адпускаю аднаго, калі ў мяне нейкія тэрміновыя справы. Дзеці таксама ўмеюць рыбачыць. Сыны Жэня і Багдан і старэйшая з дачок Эмілія спраўна ўпраўляюцца з вудамі. Паступова кожнаму з іх мы набылі па ўласнай вудзе. Малодшая Ліля, якой хутка споўніцца 5 гадоў, пакуль больш любіць назіраць за працэсам і выпускаць рыбу з далонькі ў возера. Між тым у яе ёсць свая маленькая вуда, якая таксама закідваецца па яе патрабаванні, але выцягвае ўлоў звычайна нехта са старэйшых. Бывае, што ўсёй сям'ёй размяшчаемся з вудамі на беразе.

Рыбачым мы прыблізна з канца красавіка да сярэдзіны кастрычніка, пакуль не вельмі яшчэ холадна. На лёд я не хаджу, бо, па-першае, не аматар мёрзнуць, а падругое, для зімовай рыбалкі патрэбны і іншыя вуды, і асаблівыя прылады, і экіпіроўка. Ды і на лёд рызыкоўна выходзіць, на мой погляд. Андрэй у гэтым са мной салідарны, таму позняй восенню мы закрываем сезон.

— Згадай які-небудзь кур'ёзны выпадак, які здарыўся падчас рыбалкі.

— Кур'ёзаў на рыбалцы хапала. Часта выходзіць так, што ідзём рыбачыць цэлай кампаніяй, а з уловам шанцуе толькі мне, самай нявопытнай. Нядаўна ездзілі на суседняе возера з мужам і дзядзькам — у мяне адзін за адным карасікі, больш за дзясятак, а ў іх пуста. Бывае, сядзіш, чакаеш, а на паплаўку нібыта цішыня, вырашыш паглядзець, ці ёсць на кручку нажыўка, а там рыбка дробная, аказваецца, клюнула і так ціхенька стаяла, што не відаць. Амерыканскія сомікі, якія ў нас развяліся, даволі дробныя ў параўнанні з самамі ў класічным уяўленні, але ўсёедныя і вельмі пражэрлівыя. Яны на любую нажыўку гатовы — хоць на пярлоўку ці кукурузу, хоць на булку, і ў той жа час і на чарвяка, і на мяса, і на жыўца, і нават на кавалак такога ж соміка, свайго суродзіча! І вось аднойчы мы пайшлі на рыбалку. Пакуль размяшчаліся, вуды паклалі на ваду проста так, не закідаючы, а пасля сабраліся чапляць нажыўку. Падымаю сваю вуду, а там… сомік на кручку! Аказваецца, з мінулага раза застаўся на кручку кавалак чарвяка, засох там, а сомік і на такое паквапіўся. З аднаго боку, на возеры, поўным гэтых сомікаў, гарантавана хоць якая паклёўка, аднак, яны такія дробныя — не залік! А вось большая рыба — карп ці шчупак, нават салідны акунь — так хутка і проста не ловіцца пасля з'яўлення гэтых сомікаў. Раней добрым экзэмплярам мясцовай рыбы (напрыклад, карпам кілаграмаў на 10)нікога не здзівіць было, цяпер кожны карп ці шчупак — як падзея, перадаецца з вуснаў у вусны. Ну, і я, хаця і не выказваю гучных рыбацкіх амбіцый, усё ж ціхенька пра сябе мару зловіць вялікую рыбіну.

Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Іскры добрага настрою

У рамках блока ранішніх праграм «У рытме дня» на канале «Культура» Беларускага радыё выходзяць праекты «Адным штрыхом» з вершамі і мініяцюрамі беларускіх аўтараў, а таксама «Ранішні серыял», дзе гучыць аповесць Таісы Бондар «Паветраны замак на дваіх».

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе старонкі рамана Лідзіі Арабей «Іскры ў папялішчы». У «Радыёбібліятэцы» агучваецца раман Уладзіміра Багамолава «У жніўні сорак чацвёртага». У праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных слухачоў чакаюць апавяданні.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і анонсам штотыднёвіка «ЛіМ».

Для аматараў паэзіі ў суботу і нядзелю ў праекце «Прачулым радком» прагучаць вершы Кастуся Кірэенкі.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» у выхадныя складуць дзве часткі радыёверсіі спектакля «Напісанае застаецца» па аднайменнай п'есе Алеся Петрашкевіча (да 505-годдзя беларускага кнігадрукавання).

У нядзелю і чацвер увазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Развагі пра літаратуру». Радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» гэтага пісьменніка, якая гучыць на «Культуры» ў нядзелю і сераду, прапануе сустрэчу з паэтам Хведарам Гурыновічам.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

22 жніўня — 110 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Кібальнікава (1912—1987), расійскага скульптара, народнага мастака СССР, мастацкага кіраўніка аўтарскага калектыву мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой».

22 жніўня — 105 гадоў з дня нараджэння Георгія Шчарбакова (1917—1989), беларускага рэжысёра, акцёра, педагога, народнага артыста БССР.

23 жніўня — 105 гадоў з дня нараджэння Пімена Панчанкі (1917—1995), беларускага паэта, перакладчыка, публіцыста, народнага паэта БССР.

23 жніўня — 60-гадовы юбілей святкуе Зміцер Еўтуховіч (1962), беларускі кампазітар.

25 жніўня — 90 гадоў з дня нараджэння Петруся Макаля (Пятра Міхайлавіча; 1932—1996), беларускага паэта, драматурга, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

27 жніўня — 100 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Махнача (1922—2001), беларускага драматурга, празаіка, публіцыста, заслужанага работніка культуры БССР.

27 жніўня — 75-годдзе святкуе Уладзімір Хадаровіч (1947), беларускі жывапісец.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ смуткуюць з прычыны смерці паэтэсы Алены Вадзімаўны КОШКІНАЙ і выказваюць шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія: Таццяна Арлова, Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламедаў, Вольга Дадзіёмава, Жана Запартыка, Анатоль Казлоў, Анатоль Крэйдзіч, Віктар Кураш, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі: Юрыдычны адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны: галоўны рэдактар — 325-85-25; намеснікі галоўнага рэдактара — 319-79-85, 224-66-74; адказны сакратар — 377-99-73; аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98; аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98; аддзел мастацтва — 317-20-98; бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы: 63856 — індывідуальны; 63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў; 638562 — ведамасны; 63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"». Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 18.08.2022 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 691

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку» ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004 г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 2032

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 22033